Жыві, Беларусь!

Народная Газета

Орган Вярхоўнага Савета Беларускай ССР

№ 122 (135) 26 чэрвеня 1991 г. Серада.

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1990 ГОДА НА БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ МОВАХ.

Кошт: у розніцу — 10 кап. падпісны — 3 кап.

ФАКТЫ АРГУМЕНТЫ КОММЕНТАРИИ СУЖДЕНИЯ

Наши бастуют

КАСАБЛАНКА. **76 советских моряков, находящихся в марокканском порту Касабланка, отказываются возвращаться в СССР до тех пор, пока им не будет выплачена заработная плата за три месяца.**

С 13 апреля подменный экипаж черноморского объединения «Антарктика» из города Ильичевска занят ремонтом советских судов, ведущих рыбный промысел в Атлантике. 4 июля по графику он должен завершить работу на последнем судне и вылететь в Одессу. Однако зарплаты до сих пор нет, и экипаж предъявил объединению ультиматум.

Чудо-лекарство из-за океана

МИНСК (Л. Свиридов). **Вчера город с неофициальным визитом посетила супруга бывшего посла США в Советском Союзе госпожа Ребекка Мэтлок.**

На железнодорожном вокзале ее встречали председатель исполкома Конфедерации труда Белоруссии Михаил Соболь, председатель стачечного комитета Орши Николай Разумов, представители Белорусского гуманитарного фонда.

Госпожа Мэтлок передала детской онкологии в Боровлянах четыре коробки с антибиотиками — дар американской компании. Препарат «Супрэкс», сказала она, предназначен для детей и обладает широким спектром действия. В США одна упаковка его стоит 2,5 тысячи долларов.

Госпожа Мэтлок побывала в штаб-квартире фонда «Дети Чернобыля», встретилась с председателем фонда, народным депутатом БССР Геннадием Грушевым.

Что там еще на нашу голову?..

МОГИЛЕВ (М. Килесса).

Статистика свидетельствует: на голову каждого могилевчанина, в буквальном смысле, сыплется ежегодно 192 кг сернистого ангидрида, 123 кг окиси углерода, 25 кг пыли, 22 кг окиси азота, 16 кг сероуглерода, 4 кг сероводорода.

Под ногами у могилевчанина — на 50 процентах территории города — 70 тысяч тонн радиоактивной земли, которую необходимо вывезти в места захоронения.

Превышены средние общесоюзные показатели заболеваемости по гипертонии в 3,7 раза, ишемической болезни — в 2,8, болезням эндокринной системы — в 2,1 раза, дыхательным болезням — в 1,8, онкозаболеваниям — в 1,2 раза. Ежегодный прирост смертности составляет 1,5 процента.

В Могилеве только четверть детей появляются на свет здоровыми. Острая нехватка больниц, поликлиник, школ, жилья и объектов соцкультбыта заставляют жителей города задуматься о перемене места жительства. Процесс миграции населения усиливается, и его может остановить только целенаправленная, разносторонняя помощь городу.

Цитата дня

Сейчас мы по-прежнему живем самообманом. Уговариваем себя, что жизнь не так плоха; а многие так думают и на самом деле. Мы по-прежнему гордимся тем, какие мы замечательные, что можем жить в таких трудных условиях. Даже когда молока нет, мы изнемогаем от чувства собственного достоинства — дескать, у нас и молока-то с сыром нет, а нам все равно хорошо! В нашей стране повод для гордости найти можно всегда.

Александр ГРАДСКИЙ, музыкант.



Рисунок Олега ПОПОВА.

Загнули...

Московский журнал «Столица», ссылаясь на кандидата исторических наук полковника В. О. Дайнеса, который возглавляет отдел Института военной истории Министерства обороны СССР, дал описание символа, предлагавшегося в 1918—1919 годах в качестве эмблемы Красной Армии.

В верхнем углу ромба из красного сукна — ставшая привычной пятиконечная звезда. В центре — венок, в который заключена... свастика вместе с буквами Р.С.Ф.С.Р.

«Кто конкретно создавал найденный Дайнесом в архивах символ, кто и почему его отверг, не известно. Не понятно, почему лопасти свастики, которая у древних являлась символом плодородия, загнуты в другую сторону» — констатирует журнал.

Как «достучаться» до депутатов?

87 председателей и заместителей председателей профсоюзных комитетов крупнейших предприятий и производственных объединений республики обратились в Верховный Совет БССР с письмом.

В нем высказана серьезная озабоченность тем, что проект Закона о профессиональных союзах БССР, рассмотрение которого включено в повестку дня нынешней сессии, пока не находит серьезной поддержки ни в комиссиях, ни у депутатов. А ведь необходимость такого закона в период перехода к рыночным отношениям, в период создания демократического правового государства—очевидна. Это доказано опытом западных стран, и это не могут не понимать народные избранники.

Профсоюзные активисты — авторы письма в Верховный Совет БССР — обращаются к депутатам с просьбой с максимальным вниманием рассмотреть проект Закона «О профессиональных союзах БССР», узаконить права и полномочия профсоюзов и тем самым расширить и укрепить их позиции в повседневной защите трудовых и социальных прав и интересов населения.

От крана до могильника

ГОМЕЛЬ (А. Готовчиц). **Предприятие радиационных исследований создано в Гомеле по решению горсовета.**

Оно занимается дезактивацией городской территории, промышленного оборудования, участвует совместно с ведущими институтами страны в разработке новых методов контроля за окружающей средой, возвращения в хозяйственный оборот загрязненных радионуклидами земель.

Новым предприятием выполнены работы по дезактивации на стекольном заводе им. Ломоносова, фабрике стружек. На очереди — дезактивация плавучего крана Белорусского речного пароходства, вентиляционных систем на фабрике 8 Марта.

До конца года предприятие обследует более 70 могильников с радиоактивными захоронениями, 320 га территорий, застроенных индивидуальными владельцами.

Одной должностью меньше

ВИТЕБСК. **25 июня Владимир Григорьев сложил полномочия председателя областного Совета. Сделав отчетный доклад на сессии, он рекомендовал депутатам избрать своим преемником председателя облисполкома Владимира Кулакова.**

Что и было сделано на безальтернативной основе и почти единодушно. Теперь Кулаков будет един в двух лицах — законодательном и исполнительном.

Самоотвод Григорьева можно понять — теперь у него забот убавится. Хотя и не намного. Он остается первым секретарем и членом бюро обкома КПБ, членом ЦК КПСС и бюро ЦК КПБ, народным депутатом СССР и областного Совета.

Покинув резиденцию председателя на улице Гоголя, Владимир Викторович наверняка станет регулярнее бывать в стенах обкома. И это хорошо. Частое отсутствие «первого», вынужденного отвлекаться на руководство Советом, привело к неприятному событию. По достоверным сведениям, из обкомовского кабинета Григорьева неизвестными злоумышленниками похищено ценное дореволюционное издание — энциклопедический словарь Брокгауза и Эфрона. Количество украденных томов неизвестно, но если, как говорят, 86 — то современная цена их может составить цифру с пятью нулями. Жалко книг! Теперь таких не делают...

«Самиздат» на родине Скорины

ПОЛОЦК. **Нетрадиционным образом решила ковать свой литературный успех Ядвига Двинская (в «миру» — Ядвига Зайцева).**

Выйдя на пенсию, она посвятила себя литературному творчеству. В прежние времена ее рукописи, скорее всего, остались бы «вещью в себе». Но теперь книга «Легенды Полоцкой земли» увидела свет без чрезвычайных родовых мук. Ядвига Афанасьевна издала свой труд за собственные средства, уплатив Полоцкой типографии около 4 тысяч рублей.

Увлекательное повествование об истории края, несомненно, найдет читателей, если они не пожалеют денег. Чтобы окупить расход на пятитысячный тираж, издательнице собственного произведения придется назначать за него свободную цену в пределах 4—5 рублей.

Выпуск «ФАКСа» подготовлен по сообщениям корреспондентов «Народной газеты» и агентства «Инфоновости».

Дежурили Ирина ДЕРГАЧ и Алесь СИВЫЙ.

«Горячий» телефон 32-24-02 работает ежедневно с 9 до 11 часов.



Дети строят Дом

Дети строят дома детям. Такова суть германо-советского проекта, осуществление которого началось в минувшие выходные дни в минском парке им. Горького, с открытия строительно-игровой площадки. В ее центре — сооружение невероятной конструкции. Это проект дома, который положит начало деревне для детей-сирот. Она разместится в колхозе «Новый свет» Копыльского района.

НА СНИМКАХ: на открытии строительно-игровой площадки.

Фото С. ГРИЦА.



Пастанова Вярхоўнага Савета Беларускай ССР

Аб надзвычайных мерах па выкананню бюджэту Беларускай ССР на другое паўгоддзе 1991 года

Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі **пастанаўляе:**

1. Прыняць да ведама надзвычайныя меры па выкананню бюджэту Беларускай ССР на другое паўгоддзе 1991 года.

Даручыць Савету Міністраў Беларускай ССР прыняць адпаведныя рашэнні па іх рэалізацыі.

2. Устанавіць гранічны дэфіцыт бюджэту Беларускай ССР на 1991 год у размеры 5 млрд. рублёў, у тым ліку 1 млрд. рублёў у сувязі з пакрыццём дадатковых расходаў сельскагаспадарчым прадпрыемствам, выкліканых ростам цэн на прадукцыю, якая ім пастаўляецца.

3. Савету Міністраў Беларускай ССР сумесна з выканаўчымі камітэтамі абласных і Мінскага гарадскога Саветаў народных дэпутатаў удакладніць даходы і расходы бюджэтаў абласцей і горада Мінска ў сувязі з прынятымі рашэннямі па змяненню рознічных цэн і сацыяльнай абароне насельніцтва і надзвычайнымі мерамі па выкананню бюджэту Беларускай ССР на другое паўгоддзе 1991 года. Аднесці павелічэнне дэфіцыту бюджэту ў суме 1,5 млрд. рублёў на рэспубліканскі бюджэт, захаваўшы дэфіцыт па бюджэтах абласцей і горада Мінска ў былых аб'ёмах.

4. Нацыянальнаму банку Беларускай ССР адшукаць магчымасць выдзялення крэдытных рэсурсаў за плату на дагаворных пачатках пад устаноўленыя па рэспубліканскаму і мясцовых бюджэтах гранічныя размеры дэфіцыту з улікам рэалізацыі надзвычайных мер, з далейшым іх пагашэннем за кошт адпаведных бюджэтаў.

5. Для пакрыцця дадатковых расходаў сельскагаспадарчых прадпрыемстваў і арганізацый, выкліканых павышэннем цэн на прамысловую прадукцыю, якая ім пастаўляецца, і не кампенсуемых закупачнымі цэнамі, што дзейнічаюць на сельскагаспадарчую прадукцыю, утварыць у 1991 годзе часовы спецыяльны фонд фінансавай падтрымкі сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак, арэндных калектываў, калгасаў, саўгасаў, і іншых сельскагаспадарчых прадпрыемстваў у размеры 2 млрд. рублёў. Устанавіць, што ва ўказаны фонд накіроўваецца 50 працэнтаў прыбытку дзяржаўных прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый, атрыманага пачынаючы з другога квартала 1991 года ў выніку перавышэння сярэднегаліновага ўзроўню рэнтабельнасці.

Савету Міністраў Беларускай ССР у месячны тэрмін зацвердзіць парадак утварэння і выкарыстання гэтага фонду.

Прадаставіць права Міністэрству сельскай гаспадаркі і харчавання Беларускай ССР і абласным камітэтам па сельскай гаспадарцы і харчаванню цэнтралізаваць па падпарадкаванасці да 30 працэнтаў прыбытку, які застаецца ў распараджэнні прадпрыемстваў і арганізацый сістэмы (акрамя калгасаў і саўгасаў), уключаючы птушкафабрыкі, цяплічныя камбінаты і гароднінныя фабрыкі, зверасаўгасы.

6. Устанавіць, што пачынаючы з заработнай платы за ліпень 1991 года адлічэнні на дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне ў размеры 11 працэнтаў (у сувязі з памяншэннем тарыфаў узносаў з 37 да 26 працэнтаў) па калгасах і саўгасах, якія накіроўваюцца ў бюджэт, пакідаюцца ў іх распараджэнні.

7. Савету Міністраў Беларускай ССР адшукаць у 1991 годзе крыніцы фінансавання будаўніцтва, рамонту і ўтрымання дарог агульнага карыстання ў размерах, неабходных для выканання запланаванага аб'ёму работ.

8. Увесці мараторый на прыняцце і выкананне новых праграм, якія павялічваюць расходы бюджэту.

9. Савету Міністраў Беларускай ССР забяспечыць кантроль за выкананнем міністэрствамі і ведамствамі Беларускай ССР, выканаўчымі камітэтамі абласных і Мінскага гарадскога Саветаў народных дэпутатаў надзвычайных мер па выкананню бюджэту на другое паўгоддзе 1991 года.

10. У сувязі з рэформай рознічных цэн і Указам Прэзідэнта СССР ад 22 сакавіка 1991 года «Аб увядзенні часовага парадку спагнання падаткаў з прадпрыемстваў, аб'яднанняў, арганізацый і грамадзян» у Закон Беларускай ССР ад 21 снежня 1990 года «Аб Дзяржаўным бюджэце Беларускай ССР на 1991 год» унесці наступныя змяненні:

першы сказ артыкула 4 Закона выкласці ў рэдакцыі: «Устанавіць, што ў 1991 годзе прыбытак, які абкладаецца падаткам па стаўцы 22 працэнты (пачынаючы з прыбытку, атрыманага за другі квартал па стаўцы 17 працэнтаў), прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый саюзнага і рэспубліканскага падпарадкавання з улікам асаблівасцей падаткаабкладання асобных плацельшчыкаў перадаецца ў саюзны бюджэт для рэалізацыі агульнасаюзных праграм»;

падпункт «б» артыкула 5 Закона выкласці ў рэдакцыі: «ад прыбытку прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый саюзнага і рэспубліканскага падпарадкавання, які абкладаецца падаткам, — 12 (пачынаючы з прыбытку, атрыманага за другі квартал, — 9 працэнтаў) з улікам асаблівасцей падаткаабкладання асобных плацельшчыкаў»;

у першым сказе артыкула 8 Закона пасля слоў «у размеры аднаго працэнта» дапоўніць у дужках «пачынаючы з аб'ёмаў выробленай прадукцыі (работ і паслуг) за другі квартал 1991 года ў размеры 0,5 працэнта».

Старшыня Вярхоўнага Савета Беларускай ССР М. ДЗЕМЯНЦЕЙ.

12 чэрвеня 1991 г.
гор. Мінск

Пастанова Вярхоўнага Савета Беларускай ССР

Аб выбранні першага намесніка старшыні Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларускай ССР

Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі **пастанаўляе:**

Выбраць таварыша КІСЯЛЕВА Аляксандра Іванавіча першым намеснікам старшыні Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларускай ССР.

Старшыня Вярхоўнага Савета Беларускай ССР М. ДЗЕМЯНЦЕЙ.

18 чэрвеня 1991 г.
гор. Мінск

Пастанова Вярхоўнага Савета Беларускай ССР

Аб выбранні намесніка старшыні Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларускай ССР

Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі **пастанаўляе:**

Выбраць таварыша ШЫШКОВА Васіля Іванавіча намеснікам старшыні Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларускай ССР.

Старшыня Вярхоўнага Савета Беларускай ССР М. ДЗЕМЯНЦЕЙ.

18 чэрвеня 1991 г.
гор. Мінск

Пастанова Вярхоўнага Савета Беларускай ССР

Аб уласнасці КПСС—КПБ

Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі **пастанаўляе:**

Прызнаць патрабаванні аб нацыяналізацыі ўласнасці КПСС — КПБ супярэчачымі Канстытуцыі і законам Беларускай ССР.

Старшыня Вярхоўнага Савета Беларускай ССР М. ДЗЕМЯНЦЕЙ.

18 чэрвеня 1991 г.
гор. Мінск

Деловой мир

Хороша страна Болгария

не только климатом и людьми, но и промышленными товарами, которые предлагают в «Минскэкспо» фирмы, уже зарекомендовавшие себя на мировом рынке

Торговле и коммерции любая погода по душе — лишь бы дело двигалось. Однако жар лета добавляет активности и в эту сферу. И потому в выставочном комплексе Торгово-промышленной палаты БССР в эти дни полно гостей, приехавших и нас посмотреть, и себя показать.

С 25 по 28 июня в центре внимания здесь болгарские предприниматели и коммерсанты. На нашем зарождающемся белорусском рынке они пока что новички, однако полны желания доказать свое умение, деловитость и надежность. В надежде, конечно, на такое же отношение и с нашей стороны.

Что ж, будем надеяться, что эти первые рандеву перерастут во что-то более существенное. А пока представим гостей.

Возьмите на заметку, белорусские деловые люди!

Фирма «Оптимакс» (г. Стара Загора) занимается экспортом и импортом дисковых запоминающих устройств, магнитных носителей (дискет и дисковых пакетов), видеокассет, компонентов и узлов для ДЗУ. Она предлагает установить контакты для осуществления торгово-обменных операций по ДЗУ, запчастям, компьютерам, телефаксным аппаратам, копировальным машинам, телефонам, а также оптической и лазерной техники голландской фирмы «Меллес Гриот».

«Изома» из г. Русе — производитель электроизоляционных и конструкционных материалов, предназначенных для электротехники, машиностроения, связи и т. д. Фирма торгует более чем с 12 промышленно развитыми странами. В ее производственную номенклатуру входят фолированный стеклотекстолит для печатных плат из медной фольги, гетинакс, текстолит и т. д. Потребителями фирмы являются предприятия-производители печатных плат для электроники, связи, приборостроения, производители трансформаторов, электродвигателей, мебельные предприятия, кораблестроительные и вагоностроительные заводы.

Пловдивская «Агрия» поставляет химические средства защиты растений в личном хозяйстве, колхозах и совхозах, а также проектирование инжиниринга малых перерабатывающих предприятий.

А вот наших руководителей агропромышленного комплекса, думаю, особенно должна заинтересовать фирма «Строительная техника-инжиниринг» из Софии, предлагающая технологические линии с оборудованием собственной конструкции. В экспортную программу фирмы включены комплектные технологические линии по производству кирпича мощностью 30 миллионов штук обычного формата в год; черепицы — годовой мощностью 20—25 миллионов штук; кирпича и черепицы — годовой мощностью 14 миллионов штук кирпича и 6 миллионов штук черепицы. Эти базовые разработки могут быть модифицированы применительно к условиям Белоруссии.

Фирма «Элпром», тоже из Софии, производит и экспортирует в 50 стран мира электротехнические сооружения и аппараты. Для предприятий энергетики она предлагает генераторы, гидрогенераторы, трансформаторы силовые и распределительные, комплектные трансформаторные мосты, ступенчатые регуляторы, измерительные трансформаторы, мощностные разъединители (выключатели), фарфоровые изоляторы. Фирма производит широкую гамму комплектных электроприводов (электропускателей) для металлообрабатывающих станков с ЧПУ и промышленных роботов, для прессового оборудования, для машин легкой промышленности, ступенчатые электродвигатели, аппаратуру низкого напряжения и т. д. Для автономного электропитания предлагаются бензиновые и дизельные электроагрегаты — транспортируемые и стационарные, сварочные агрегаты.

Жаль, не смогли приехать по техническим причинам представители фирмы «Храпивест» из г. Стара Загора, «конек» которой — пищевое машиностроение. Однако всем, кто занимается или желает заняться производством пива, безалкогольных напитков, хлебобулочных изделий, сыра и т. д., тоже дадут полную информацию об этом возможном партнере.

Словом, выбор деловых партнеров широк. Так же широки и формы взаиморасчетов, которые будут устанавливаться по взаимной договоренности. И чем раньше завяжутся конкретные проекты, тем лучше для всех. Наши болгарские друзья ждут всех заинтересованных людей с 10 до 17 часов ежедневно по 28 июня включительно.

Так что спешите: время — деньги.

Павел СТАСЕВИЧ.

Народная газета

Новость и подробности

Сами себе хозяева

Вновь обрел утраченный много лет назад статус, отказавшись быть совхозом, колхоз «Положевичи» Стародорожского района.

Преодолевший связанную с этим бюрократическую волокиту, председатель правления Михаил Васильевич Чечухо объяснил это так:

— Нам сегодня, как никогда, нужна самостоятельность для того, чтобы решать, где и что сеять, кому, что и за сколько продавать, куда направить вырученные средства.

За семь лет директорства в бывшем совхозе Михаил Васильевич хорошо прочувствовал путы диктата и полную бесперспективность хозяйствования на земле, когда ты хозяином не являешься. Это несмотря на то, что «Положевичи» был в районе на хорошем счету.

Жилье строится по различным проектам. Сейчас, например, на центральной усадьбе возводится несколько домов прибалтийского варианта. Жить в них и просторно, и удобно.

П. ПОБОКО,
корр. БЕЛТА.

НА СНИМКАХ:

● Молодая семья Игоря и Аллы Довнар переехала в Положевичи из Солигорска. Сейчас у них здесь есть дом и работа, хорошие соседи и друзья.

● Асфальтируются улицы в деревне Гладиловичи.

Фото Аркадия НИКОЛАЕВА.
(БЕЛТА).

Из жизни инициативных

За охотничьими сосисками приезжайте в Сенно

В последнее время во многих колхозах и совхозах Сенненского района построены цеха по переработке сельскохозяйственной продукции.

В совхозе «Пламя» работает цех по производству чипсов из картофеля. За 1990 год прибыль здесь составила 175 тысяч рублей. А работает в смене всего 6 человек, которые производят ежедневно более 250 килограммов высококачественной продукции. В колхозе имени Буденного успешно работает цех по производству картофеля «Жареный оригинальный». За 1 килограмм такого деликатеса платят покупатели 12—15 рублей. Картофельная продукция сенненцев пользуется большим спросом не только у себя и у витебчан, ее закупают Псков, Смоленск, Ленинград.

Предприимчивость тружеников района видна во всем. Тут используют каждую возможность, местные условия и сырье, которым богата Сенненщина. В колхозе «Ясная заря» на 27 гектарах выращиваются травы, являющиеся основными компонентами для производства бальзама. Уже третий год тут производят чайный напиток «Сенненский», который продается жителям района и гостям.

Заканчивается работа по установке оборудования в цехе по производству кумыса в колхозе имени Тимирязева. Подобрано поголовье лошадей, привлечены серьезные специалисты. В этом же хозяйстве строится цех по производству гречневой крупы. С этой целью уже нынешней весной расширены посевные площади гречихи до 100 гектаров.

А вот и наглядные факты из жизни предприимчивых. В марте в совхозе имени Горовца запущен цех по производству охотничьих сосисок, в котором трудятся специалисты, приглашенные из Минска. Приступили к отработке технологии по производству пива в Сенно. Так что уже этой зимой сенненцы будут иметь свое пиво «Сенненское».

В совхозе «Хотцы» планируется строительство цеха по производству детского питания. Имеется договоренность с шахтерами Донбасса о закупке импортного оборудования для этих целей. К концу 1992 года планируется из нового урожая получить продукцию, так необходимую для питания детей.

Доброе начинание сделали торговые работники. Они не стали ждать, когда им что-то привезут из области и Минска в магазины района. С августа прошлого года по январь 1991-го они завезли в район на 2 миллиона 800 тысяч рублей продукции и товаров, децентрализованных заготовок, в этом году — уже почти на 700 тысяч рублей. В районе надеются не только на привоз плановых товаров, но и начали искать резервы и возможности производить, заготавливать продукцию у себя в хозяйствах. Так, в колхозе «Ульяновичи» в столовой оборудовали маленький цех по производству колбасы, такое же переоборудование осуществили в столовой колхоза «Яново», в совхозе «Пламя». Жители этих и других хозяйств всегда могут купить свежую колбасу, мясные изделия собственного изготовления. Остается сказать, что все эти и многие другие добрые начинания, дела стали возможны во многом благодаря инициативе, последовательным действиям председателя Совета народных депутатов, первого секретаря райкома партии Н. Ф. Домашкевича, его единомышленников, руководителей хозяйств, подразделений районных служб В. З. Кацера, А. А. Кубарского, В. А. Ткаченко, В. И. Василёнка, В. И. Шлыкова, В. П. Приставки, А. Г. Шарендо и других. А научное обоснование, консультации, проекты разработок по технологии делают ученые Белорусского научно-производственного объединения по переработке картофеля и продуктов питания во главе с его директором Анатолием Макаровичем Мазуром, а также руководители и коллективы ПМК-64, ПМК сельхозтехники, сельэнерго, которые проводят переоборудование столовых, других общепитовских объектов.

Как после этого не поверить, что разные формы собственности могут прекрасно сосуществовать и приносить людям пользу! Было бы только желание и инициатива.

Виктор ЛОМАШЕВ.
Сенненский район.

Пра тое, што хвалюе

Адгукніцеся, людзі з Рэпішча!

Усхвалявала мяне невялічкая заметка, надрукаваная мінулым летам у газеце літоўскіх палякаў «Кур'ер віленскі». У ёй паведамлялася, што нямецкая сям'я з аднаго заходнегерманскага гарадка шукае сваякоў хлопца з Віленшчыны Генрыха Юзафовіча. Юнак быў на прымусовых работах у Нямеччыне і ў час адной з бамбардзіровак загінуў.

У сям'і немцаў захавалася добрая памяць аб Г. Юзафовічу. І вось яны праз шмат гадоў вырашылі знайсці родных Генрыха, каб запрасіць іх да сябе, расказаць пра жыццё і смерць маладога чалавека на чужой зямлі, паказаць яго магілу. Аўтарам просьбы вядома, што родам хлопец з вёскі Рэпішча, якая дзесьці ў Віленскай старане, што ён — сын Яна і Тэафіліі (дзявочае прозвішча Білевіч).

І апошняе. У заўвазе рэдакцыі было сказана, што ў сённяшніх межах Віленскага краю Літвы вёскі Рэпішча няма. Значыць, шукаць сваякоў Г. Юзафовіча варта ў бліжэйшых раёнах Беларусі. Я ўзяўся за пошук на Гродзеншчыне. Ды безвынікова. Тады звязаў надзеі з заходнебеларускімі раёнамі Мінскай і Віцебскай абласцей. Па даведніку Я. Рапановіча выявіў, у якіх сельсаветах ёсць населеныя пункты Рэпішча. І даслаў запыты у Будслаўскі сельсавет Мядзельскага, Круляўшчынскі Докшыцкага, Цяцеркаўскі Браслаўскага, Новапагоскі і Завуцкі Міёрскага раёнаў.

Мінуў месяц, пайшоў другі, а сельсавецкія работнікі маўчаць. Няўжо ім цяжка напісаць пару радкоў у адказ?! Таму я праз «Народную газету» звяртаюся да жыхароў Рэпішча, у якім жыў Генрых, з просьбай адгукнуцца і коратка напісаць на адрас: 231300, г. Ліда, Ламаносава, 10, кв. 6.

Аляксандр ЖАЛКОЎСКІ.

В храмах не свистят и не кричат

Я не политик, не состою ни в какой партии. Я — простая советская женщина. А заставили меня написать вам те события, которые происходили на площади Ленина в Минске не так давно.

Не понимаю, почему разрешается проводить митинги именно на этой площади, которая должна быть святой. С ужасом, с болью в сердце смотрела и слушала то, что происходило. Крик, свист, ругань, оскорбительные и унизительные слова...

Когда видишь все, что творится сегодня, невольно вспоминаешь первые послевоенные годы. Я была очевидцем, как очищали от развалин, от битого стекла, кирпича эту площадь студенты после занятий, члены правительства после работы и другие жители города. Они не бастовали, не кричали «Долой!», «Дай!». У них была одна цель: поднять из руин город, республику, страну. Они думали о лучшей жизни народа. И не предполагали даже, что через несколько лет найдутся люди, которые будут обливать их грязью.

Я могла бы это письмо послать в редакцию какой-нибудь газеты. Но я уже имею опыт: такие письма газеты не публикуют, поэтому пишу вам. А еще предлагаю издать закон, который запрещал бы проведение митингов, подобных тем, которые проводились на площади Ленина. Пусть митингуют во дворах своих предприятий. Можно указать какое-нибудь другое место в Минске, но только не на главной площади столицы. Здесь же должны проводиться мероприятия, которые поднимали бы духовную, национальную и общечеловеческую культуру народа.

В церквах, в храмах не свистят, не кричат. И здесь так должно быть. Можно проводить и богослужение, и фольклорные концерты, организовать разные праздники и многое другое, но не крикливые митинги, которые не всегда поддерживаются большинством народа.

Нина ТЕРЕШКОВА.
г. Борисов.

А Забэйду-Суміцкаму месца не знайшлося

Выдавецтва «Савецкая энцыклапедыя» (г. Масква) выпусціла ў свет музычны энцыклапедычны слоўнік. Пачынаеш шукаць у ім інфармацыю пра вялікіх музыкантаў Пружаншчыны. Міхась Забэйда-Суміцкі...

Спявак, чый талент музычныя крытыкі ставілі побач з імем славутага Собінава, голасам якога ў 30-я гады захаплялася ўся Еўропа. Нарэшце настаў той справядлівы час, калі пераадолены шматступеньчатыя перашкоды і на радзіму вярнуўся архіў песняра. Тым самым мы маем цяпер магчымасць адчуць асалоду выканаўчага таленту Забэйды-Суміцкага, якую ён нёс беларускаму народу праз увесь трагізм свайго жыцця. Але, на жаль, шаноўныя аўтары слоўніка не ўдастоілі сваёй увагай вялікага спевака ніводным радком і тым самым пазбавілі вялікую колькасць прыхільнікаў музычнай культуры знаёмства з цудоўным талентам Міхася Забэйды-Суміцкага.

Што датычыць яшчэ аднаго нашага вядомага земляка, паплечніка Забэйды-Суміцкага — Рыгора Раманавіча Шырмы, то слоўнік утрымлівае даволі падрабязную інфармацыю пра яго.

Хацелася б, каб на іх радзіме былі музеі, якія б сталі месцам паломніцтва музыкантаў свету, цэнтрам эстэтычнага прыцягнення. Тым больш, што ў наступным годзе спаўняецца 100 гадоў з дня нараджэння Р. Р. Шырмы. А не за гарамі такі ж юбілей М. Забэйды-Суміцкага.

Алег ВЕРБАВІКОЎ,
настаўнік.
г. Пружаны.

Помогите вернуть радость

Несколько лет назад возле кинотеатра «Киев» был построен фонтан — цветной, играющий — радовал всех своей красотой и привлекал живущих по-соседству детишек и взрослых.

А сейчас уже второй год не работает, и никому нет дела до того, что фонтан разрушается, что растасканы дорогие облицовочные плиты. Зачем выброшены народные деньги? Где его хозяин? Где совесть того, кто за него отвечает? Может, это Центральный райисполком? Помогите, дорогие товарищи, найти хозяина, и пусть фонтан станет работать на радость детей и взрослых.

Иван ГОРДЕЙЧИК,
ветеран-инвалид труда II группы.

Погляд народнага дэпутата БССР

ЧАМУ НАМЕНКЛАТУРА ЗА ПРЭЗІДЭНТА

Набліжаецца да завяршэння 4-я сесія Вярхоўнага Савета БССР, якую, прабачце за вобразнае параўнанне, я назваў бы сесіяй партыйнай дэградацыі. Дэградацыі, перш за ўсё, палітыкі КПБ у Вярхоўным Савеце, калі нават у іхнім «маналітным адзінстве» пачаўся раскол.

Перад гэтым па Беларусі пракацілася хваля рабочых забастовак, дзе рабочымі былі выстаўлены асноўныя палітычныя патрабаванні, якіх ужо трэці год дамагаецца Беларускі Народны Фронт, — аб суверэнітэце Беларусі, дэпартызацыі вытворчасці, прававых органаў, вяртання нарабаванай маёмасці КПСС народу, дэмакратызацыі ўлады, выхаду з эканамічнага паралічу, пераходу да рынку і г. д.

Забастоўкі і патрабаванні разглядзець дамаганні рабочых на сесіі Вярхоўнага Савета моцна напалохалі камуністычную наменклатуру і асобных камуністаў, што, выехаўшы на спіне БНФ у Саветы, разыгрывалі з сябе дэмакратаў «на 95 працэнтаў». Забастоўкі ўсё паставілі на месца — «дзевяностапяціпрацэнтнікі» перакінуліся на сто працэнтаў да наменклатуры, якая, як вядома, на недахоп халуёў ніколі не скардзілася.

Аднак партыйная наменклатура і былыя дзевяностапяціпрацэнтныя «дэмакраты» зусім не думалі хаця б часткова выконваць патрабаванні рабочых. За кароткі час быў складзены план ціхага дзяржаўнага перавароту і зацверджаны ў павестцы дня 4-й сесіі, нягледзячы на супраціўленне дэпутацкай апазіцыі Народнага Фронту. У аснове падрыхтоўкі перавароту — пакет антыканстытуцыйных, проціпраўных законапраектаў, якія меркавалі прыняць, як заўсёды, пад сілавым націскам наменклатурнай большасці, шляхам ашуканства і грубых парушэнняў рэгламенту. Ставілася задача стварыць бачнасць заканадаўчай базы для ўсталявання наменклатурна-камуністычнага дыктатарскага рэжыму на Беларусі. Галоўнымі з гэтага пакета з'яўляюцца законапраекты «Аб прававым рэжыме надзвычайнага становішча», «Аб пераразмеркаванні паўнамоцтваў паміж вышэйшымі дзяржаўнымі органамі Беларускай ССР» і «Аб заснаванні пасады прэзідэнта Беларускай ССР». Ва ўсіх гэтых законапраектах прадугледжаны грубыя парушэнні правоў чалавека з боку дзяржаўных структур. Бясспраўе прапануецца ўвесці ў ранг закона. Рухавіком задумы, які ажыццёвіць план, павінна стаць прэзідэнцкая ўлада.

Справа ў тым, што ў тых сацыяльна-палітычных варунках, што існуюць зараз на Беларусі, прэзідэнцкая ўлада аўтаматычна вядзе да магчымасці адміністрацыйна-партыйнай дыктатуры. Нельга параўноўваць Беларусь з Расіяй, дзе ёсць беспартыйны лідэр, надзелены дэмакратычнай уладай і паўнамоцтвамі, дзе неабходнасць прэзідэнцтва вынікала з перыпетый палітычнай барацьбы паміж Гарбачовым і Ельцыным, паміж магчымасцямі дэмакратычнай Расіі і аўтарытарна-таталітарным СССР (Цэнтрам), паміж магчымасцю суверэннай Расійскай Федэрацыі і унітарным Савецкім Саюзам. Вось па гэтай лініі падзелу з глыбіні дэмакратычнага руху і ўсплыло прэзідэнцтва ў Расіі і было падтрымана народам, бо аб'ектыўна спрыяе суверэнітэту і дэмакратыі ў РСФСР.

Прэзідэнцтва ў Беларусі ўсплыло як ідэя партыйна-апаратная ў выніку жаху партыйнай бюракратыі і бездапаможнасці перад размахам дэмакратычнага рабочага руху, усплыло як апошні шанц вярнуць і сцвердзіць былы абсалютызм улады КПБ праз прэзідэнцкія формы праўлення.

І сапраўды. Што перашкаджала Савету Міністраў, Вярхоўнаму Савету БССР, прэм'еру В. Кебічу ажыццяўляць сваю ўладу, праўджваць свае законы, рабіць дэмакратычныя пераўтварэнні, рухацца да рыначнай эканомікі, да выхаду з крызісу? Што? Уся ўлада ў іхніх руках. Усюды камуністычная «падаўляючая большасць». Яна магла прыняць любы закон, любое рашэнне. І прымала, і вырашала, і рабіла, што хацела, і не збіралася ўводзіць пасаду прэзідэнта. Пакуль не адчула, як пад энергіяй народнага рабочага руху захісталіся крэслы і наменклатурная верхавіна. Вось тут і пачалі ратавацца, марыць пра моцную прэзідэнцкую руку і надзвычайныя паўнамоцтвы, дэмагагічна абгрунтоўваючы свой кармушачны страх інтарэсамі народа і «Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі».

Уся структура кіравання на Беларусі з верху да нізу наскрозь партыйна-наменклатурная. Камуністычны апарат поўнасцю ці амаль поўнасцю кантралюе выканаўчую і савецкую ўладу, прэсу, радыё, тэлебачанне — усе сродкі масавай інфармацыі. Наша рэспубліка — гэта, вобразна кажучы, запаведнік камунізму. Цэлыя групы, слаі насельніцтва (напрыклад, сяляне-калгаснікі) поўнасцю сацыяльна залежныя ад камуністычнай адміністрацыі, творыцца шмат бясправія, беззаконня.

У такіх варунках выбраць свайго «прэзідэнта» наменклатуры будзе няцяжка. Нядаўні ашуканскі фарс з «рэферэндумам» добра тое пацвярджае. Калі ж недзе надарацца цяжкасці — пойдуць напралом, топчучы законы і мараль, выкарыстаюць і галасы чужога войска, і фальсіфікацыі, і ўсе сродкі, што апраўдваюць іхнія мэты. Камуністы заўсёды так рабілі. Успомнім выбары ў Саветы.

Для нармальнага функцыянавання прэзідэнцкай пасады неабходны перш за ўсё прафесійны дэмакратычны парламент, які з'яўляецца процівагай уладзе прэзідэнта і кантралюе яго. Добра, калі існуе грамадзянская супольнасць і дэмакратычныя інстытуты кантролю за функцыямі кіравання, калі жывуць традыцыі шматпартыйнасці, дзейнічаюць спелыя палітычныя партыі. Неабходна адпаведная вертыкальная структура прадстаўнічай і выканаўчай улады, а не яе імітацыя ў выглядзе Саветаў і іх органаў. Неабходна замацаванне гэтай структуры ў Канстытуцыі Беларусі, патрэбны закон аб грамадзянстве, аб муніцыпальным кіраванні. Усё гэта распрацавала апазіцыя БНФ, і ўсё гэта было адкінута наменклатурнай большасцю Вярхоўнага Савета.

Калі ж усяго гэтага няма, а існуе толькі партыйна-савецкая сістэма адміністравання пад кантролем і кіраўніцтвам ЦК КПБ — выбранне прэзідэнта з усімі яго паўнамоцтвамі аўтаматычна адчыняе магчымасці да дыктатуры яго асобы і карпарацыі, што за ёй стаіць. Адным словам, з'яўляецца рэальная магчымасць вяртання да абсалютнай улады першага сакратара ЦК КПБ, або крэатуры ЦК, толькі праз інстытут прэзідэнцтва з бачнасцю фармальнай легітымнасці і законнасці.

А зброя да новага дыктатарскага рэжыму камуністычнай наменклатуры ўжо падрыхтавана. Гэта законапраект «Аб пераразмеркаванні паўнамоцтваў паміж вышэйшымі дзяржаўнымі органамі», дзе функцыі Вярхоўнага Савета перадаюцца яго Прэзідыуму, і законапраект "Аб прававым рэжыме надзвычайнага становішча", які ў поўным сэнсе антынародны.

Трэба заўважыць, што ў цяперашніх варунках на Беларусі нават дэмакратычны прэзідэнт, калі б раптам ён быў выбраны (што практычна выключаецца), не змог бы правесці ніякіх рэформ. Яны захлынуліся б у партыйна-бюракратычным балоце Вярхоўнага Савета, Саўміна і ва ўсіх органах так званай савецкай улады. А ўсе свае грахі камуністы пастараліся б зваліць на гэтага дэмакратычнага прэзідэнта і абвінавацілі б у пагаршэнні жыцця дэмакратычны народны рух. Гэта быў бы, як кажуць, прэзідэнт-камікадзэ.

Рэальнай альтэрнатывай наменклатурнаму «прэзідэнцтву» можа стаць прафесійны дэмакратычны парламент. Пакуль што Беларусі трэба ісці па шляху парламенцкай рэспублікі. Яна да гэтага больш падрыхтаваная. Акрамя таго, такі шлях гарантуе дэмакратыю на Беларусі, развіццё рэформ, сацыяльныя перамены, рэалізацыю правоў чалавека, паступовую дэпартызацыю вытворчасці, арганізацый, устаноў, прававых органаў, палітычную дэманапалізацыю грамадства. Ён стасуецца з нашай палітычнай мэтай — незалежнай суверэннай Беларуссю як бяз'ядзернай зонай і нейтральнай дзяржавай. Найбольш верагодны шлях да прафесійнага парламента — нечарговыя выбары.

Аднак прэзідэнцтва патрэбна наменклатуры не праз паўгода, не праз год, а цяпер, неадкладна. Яна баіцца восені. Бо ведае, якое жыццё падрыхтавала свайму народу. Таму ў законапраекце прадугледжана, што першы прэзідэнт выбіраецца на сесіі Вярхоўнага Савета. На сесіі ж цяперашняга Вярхоўнага Савета, калі ЦК загадае, можна выбраць прэзідэнтам нават каня, не тое што першага сакратара.

Тым не менш гэтае палажэнне законапраекта пры галасаванні пакуль не прайшло. Большасць прагаласавала за ўсенароднае выбранне. Я кажу «пакуль», бо пытанне пра заснаванне пасады прэзідэнта на Беларусі з'яўляецца канстытуцыйнай нормай і будзе прынятае толькі тады, калі за адпаведную папраўку ў Канстытуцыю прагаласуе 2/3 дэпутатаў. (Дарэчы, камуністычны друк поўнасцю дэзінфармаваў грамадскасць рэспублікі, паведаміўшы, што пытанне з прэзідэнцкай пасадай ужо вырашана.) Наменклатуры неабходна правесці канстытуцыйную папраўку аб прэзідэнцтве. У ход пушчана хітрая дэмагогія, мэта якой — стварыць у тых дэпутатаў, што выступаюць за выбранне прэзідэнта ўсім народам, а не на сесіі, перакананне, што папраўка ў Канстытуцыю гарантуе гэтае палажэнне.

І шмат якія дэпутаты не разумеюць, што, як толькі будзе прынята папраўка ў Канстытуцыю аб пасадзе прэзідэнта і аб выбранні яго ўсенародным галасаваннем, партгрупа тут жа правядзе звычайным галасаваннем палажэнне ў закон аб выбранні першага прэзідэнта на гэтай сесіі. Прыёмы і метады добра вядомыя. Тут і перагаласаванне, і пастаноўка на галасаванне фармальна зменёнай папраўкі пра выбранне першага прэзідэнта, і іншыя магчымасці, пра якія наменклатура добра ведае. У выніку ўсе дэпутаты, хто паверыць, будуць проста абдураны.

Таму дэпутатам належыць быць вельмі ўважлівымі. Але не прайграць у гэтай наменклатурнай гульні можна толькі тады, калі тыя дэпутаты, што стаяць за прэзідэнта, выбранага ўсенародна, і супраць выбрання на сесіі, не прагаласуюць за папраўку ў Канстытуцыю аб увядзенні пасады прэзідэнта на Беларусі. Калі ж гэтыя дэпутаты, наіўна паверыўшы, прагаласуюць за папраўку — яна можа набраць 2/3 галасоў і пройдзе. Тады можна не сумнявацца, што прэзідэнта прапануюць выбраць зараз жа, на гэтай сесіі.

Што датычыць апазіцыі Народнага Фронту, то яна, як было аб'яўлена, не галасуе ні за якія прапановы аб прэзідэнцтве і не ідзе ні на якія перамовы з партгрупай па гэтым пытанні.

У апошні момант наменклатура распаўсюдзіла новы тэкст законапраекта «Аб пераразмеркаванні паўнамоцтваў паміж вышэйшымі дзяржаўнымі органамі БССР». Працытую, чаго яны дамагаюцца:

«Предоставить Президиуму Верховного Совета Белорусской ССР право:

— вносить в случае необходимости изменения в действующие законодательные акты Белорусской ССР;

— давать толкование законов Белорусской ССР;

— отменять решения областных и Минского городского Советов народных депутатов в случае несоответствия их закону;

— производить необходимые изменения в структуре Совета Министров БССР;

— вносить изменения в состав Верховного Суда Белорусской ССР, областных и Минского городского судов, Высшего хозяйственного суда БССР;

— объявлять мораторий на забастовки, митинги, уличные шествия, демонстрации и пикеты, дестабилизирующие обстановку в республике;

— рассматривать представления Прокурора Белорусской ССР и давать согласие на привлечение народного депутата местного Совета народных депутатов к уголовной ответственности, арест или применение мер административного взыскания, налагаемых в судебном порядке, **при отсутствии на то согласия соответствующего местного Совета** народных депутатов. При даче согласия на привлечение народного депутата местного Совета к ответственности Президиум Верховного Совета БССР лишает народного депутата депутатской неприкосновенности».

Як бачым, гэтыя палажэнні гавораць самі за сябе. Калі такі закон прыняць, то Вярхоўны Савет практычна ўжо непатрэбны. Усім будзе распараджацца Прэзідыум. Дэпутаты ўсіх узроўняў будуць бясспраўныя перад ім, гэтак жа, як і насельніцтва. Неабмежаваную ўладу атрымаюць члены Прэзідыума.

Аналагічныя таталітарныя паўнамоцтвы павінен атрымаць Саўмін і прэм'ер В. Кебіч. Працытую толькі некалькі з іх (у Вярхоўным Савеце ігнаруюць закон аб мовах. Большасць дакументаў рыхтуюць па-расійску):

«— устанавливать имущественную ответственность предприятий, учреждений и организаций, а также материальную ответственность их руководителей за отказ или уклонение от заключения хозяйственных договоров на поставку продукции, товаров, производство работ **в соответствии с государственным заказом...»** А некалькімі абзацамі вышэй фальшыва пішацца пра пераход да «рыначнай эканомікі».

Прэм'ер В. Кебіч будзе «отстранять от исполнения обязанностей руководящих работников предприятий, учреждений и организаций, относящихся к коллективным (!) формам собственности... освобождать от занимаемых должностей членов правительства.., назначать членов правительства.., отстранять от исполнения обязанностей должностных лиц исполнительных органов местных Советов народных депутатов» і г. д. Законапраект, якім хочуць ліквідаваць функцыі Вярхоўнага Савета і ўвесці партыйна-адміністрацыйную дыктатуру ў выпадку, калі праваліцца задума аб увядзенні прэзідэнцтва.

Разгляд законапраектаў аб увядзенні пасады прэзідэнта прадоўжыцца зноў з 26 чэрвеня. І няма гарантыі, што пры апусцелай плошчы і маўклівай апатыі народа не пачнецца на Беларусі яе чарговая ціхая драма.

Зянон ПАЗЬНЯК,
народны дэпутат БССР.

День Союза

СКОЛЬКО ЧЕРНОБЫЛЕЙ БЫЛО В СССР?

Как сообщил в интервью «Независимой газете» председатель подкомитета по атомной энергетике и ядерной экологии Верховного Совета СССР Александр Пенягин, в СССР до Чернобыля произошли три крупнейшие радиационные аварии. На производственном объединении «Маяк» в Челябинской области оборонщики с 1949 года сбрасывали ядерные отходы в реку Течь и облучили почти 140 тысяч человек. В населенных пунктах, расположенных на ее берегах, зарегистрировано почти тысяча случаев лучевых заболеваний, гораздо больше, чем в Чернобыле.

В 1957 году на том же «Маяке» взорвалась емкость с радиоактивным содержимым. Радиоактивный выброс вполне сопоставим с Чернобылем — 20 млн. кюри против 50 млн. чернобыльских. Еще два миллиона кюри радиоактивное облако пронесло по Свердловской и Тюменской областям.

Постоянным источником радиоактивной опасности является озеро Карачай (у того же «Маяка») — накопитель емкостью 120 млн. кюри. В него и сейчас сбрасывают отходы. Радиоактивная пыль с берегов Карачая уже сейчас облучила 41 тысячу человек.

На загрязненных после чернобыльской катастрофы территориях проживают 4,8 млн. человек, на Южном Урале—0,5 миллиона, в районе Семипалатинского полигона — 0,5 миллиона. Сейчас собираются данные по полигону на Новой Земле.

ОБЪЕДИНИТ ЛИ САХАЛИН КОРЕЮ?

Ассоциация сахалинских корейцев, выступающая за скорейшее мирное объединение Кореи, предложила провести на Сахалине в августе нынешнего года фестиваль национальных искусств с участием артистов КНДР и Республики Корея. По замыслу инициаторов фестиваля, эта встреча станет еще одним шагом к объединению их исторической родины.

Ведущий специалист по вопросам корейского населения Сахалинского облисполкома Ри Му Хен сказал, что Республика Корея с удовлетворением приняла официальное приглашение сахалинцев и выразила готовность принять участие в фестивале. Ответа из КНДР пока не поступило.

В РОССИИ ВОЗРОДИТСЯ АРМЯНСКАЯ ШКОЛА

В постоянном представительстве Республики Армения в Москве подписано соглашение между Министерством образования РСФСР и Министерством просвещения Республики Армения. Стороны исходят из факта признания безусловного суверенитета в области образовательной политики по отношению ко всем типам учебно-воспитательных учреждений, находящихся на их территории. Договор предусматривает возрождение армянской школы в России, и российская сторона впервые принимает на себя обязательства всячески способствовать этому. Армения, в свою очередь, будет продолжать работу по обновлению русской школы в республике. Документ подписан сроком на два года и вступает в силу со дня подписания.

СИТУАЦИЯ БУДЕТ УХУДШАТЬСЯ

«Состояние экономики Латвии, мягко говоря, плачевное. Спад производства становится ощутимее». Такую оценку высказывает первый заместитель председателя Кабинета министров СССР Владимир Величко на страницах газеты «Советская Латвия» в связи с состоявшимися в Кремле очередными консультациями между руководимой им союзной комиссией и руководством Латвийской республики. По его словам, с 1 июля ситуация станет ухудшаться еще быстрее, так как «упрямство депутатов Верховного Совета республики лишило ее экономику режима наибольшего благоприятствования, льготных кредитов, валютных средств из части союзных фондов».

«МЯТЕЖ» СИБИРСКИХ КОММУНИСТОВ

К отставке первого секретаря РКП Ивана Полозкова призвали 11 лидеров областных партийных организаций Сибири. 43-летний Владимир Миндолин, первый секретарь Новосибирского обкома РКП, так прокомментировал этот вотум недоверия Ивану Полозкову: «Когда политическая партия проигрывает на выборах (имеются, конечно, в виду состоявшиеся всенародные выборы Президента России. — **«Н»**), лидер проигравшей партии уходит со своего поста, если уж мы декларируем приверженность цивилизованным методам политической борьбы. К тому же в нынешних условиях лидер партии должен обладать гибкостью, смелостью, способностью быстро менять тактику. Словом, новые задачи требуют для их решения и новых людей».

Народная газета

Закон Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі

АБ КУЛЬТУРЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ ССР

Кіруючыся Канстытуцыяй (Асноўным Законам) Беларускай ССР і Дэкларацыяй аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР, зыходзячы з норм міжнароднага права, усведамляючы жыццёвую неабходнасць адраджэння беларускай культуры, захавання яе самабытнасці, цэласнасці і стварэння спрыяльных умоў для яе далейшага развіцця, як і для развіцця культуры грамадзян Беларускай ССР усіх нацыянальнасцей, Вярхоўны Савет Беларускай ССР прымае Закон Беларускай ССР «Аб культуры ў Беларускай ССР».

Закон накіраваны на:

рэалізацыю суверэнных правоў Беларускай ССР у галіне культуры;

ажыццяўленне прынцыпаў ідэалагічнай і палітычнай незалежнасці культуры ад грамадска - палітычных структур;

стварэнне прававых умоў для свабоднага самаразвіцця культурных працэсаў;

забеспячэнне матэрыяльных і фінансавых гарантый развіцця культуры і сацыяльную абарону работнікаў культуры ва ўмовах рыначных адносін.

Раздзел I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 1. Заканадаўства аб культуры ў Беларускай ССР

Заканадаўства аб культуры ў Беларускай ССР складаецца з гэтага Закона і прынятых у адпаведнасці з ім іншых заканадаўчых актаў Беларускай ССР.

Артыкул 2. Задачы заканадаўства аб культуры

Заканадаўства Беларускай ССР аб культуры рэгулюе грамадскія адносіны па ўстанаўленню арганізацыйна-прававых і эканамічных гарантый стварэння, захавання, распаўсюджвання і папулярызацыі твораў матэрыяльнай і духоўнай культуры, па захаванню і перадачы культурных традыцый, па ахове гістарычных і культурных каштоўнасцей у мэтах:

адраджэння і развіцця беларускай нацыянальнай культуры і культур нацыянальных супольнасцей Беларусі як саставной часткі агульначалавечай культуры;

фарміравання культурнага асяроддзя, маральных асноў, эстэтычных поглядаў і густаў народа і далучэння яго да мастацкай творчасці, да гуманістычных каштоўнасцей культуры.

Артыкул 3. Асноўныя прынцыпы культурнай дзейнасці

Асноўнымі прынцыпамі культурнай дзейнасці ў Беларускай ССР з'яўляюцца:

свабода творчай дзейнасці і самаразвіццё культурных працэсаў, плюралізм напрамкаў і стыляў у творчасці, адмаўленне ад манапалізму ў культуры;

абарона інтэлектуальнай уласнасці;

агульнадаступнасць духоўных каштоўнасцей;

права на бесперашкодную культуратворчую дзейнасць на тэрыторыі Беларускай ССР для ўсіх нацыянальных супольнасцей;

прыярытэт умоў для развіцця беларускай нацыянальнай культуры;

гуманістычная накіраванасць, узмацненне асабовага пачатку ў культурнай дзейнасці, арыентацыя на агульначалавечыя каштоўнасці, высокамаральны характар культуры;

забеспячэнне сувязей беларускай нацыянальнай культуры з культурамі іншых народаў;

спалучэнне дзяржаўных і грамадскіх асноў у арганізацыі культурнай дзейнасці;

поўная самастойнасць культурнай дзейнасці Беларускай ССР.

Раздзел II. ГРАМАДЗЯНІН, ДЗЯРЖАВА І КУЛЬТУРА

Артыкул 4. Права грамадзян Беларускай ССР на творчасць і карыстанне дасягненнямі культуры.

Грамадзяне Беларускай ССР маюць права на свабоду мастацкай творчасці і права на карыстанне дасягненнямі культуры.

Грамадзяне Беларускай ССР маюць права займацца любым відам культурнай дзейнасці, акрамя той, што забаронена Законам, і аб'ядноўвацца ў творчыя саюзы, асацыяцыі, таварыствы і іншыя культурныя суполкі.

Артыкул 5. Абавязкі дзяржавы ў галіне культуры

Дзяржаўныя органы ва ўзаемадзеянні з грамадскімі аб'яднаннямі абавязаны забяспечваць развіццё культуры і нясуць адказнасць за духоўнае, маральнае і эстэтычнае выхаванне грамадзян. Яны абавязаны ўдасканальваць сістэму сацыяльных, арганізацыйна - прававых і эканамічных гарантый развіцця мастацтва і культуры і ствараць неабходныя ўмовы для далучэння грамадзян да нацыянальнай і сусветнай культурнай спадчыны; фарміраваць сістэму прадпрыемстваў і ўстаноў мастацтва і культуры; выдзяляць неабходныя матэрыяльныя і фінансавыя сродкі; забяспечваць правядзенне навуковых даследаванняў і распрацоўку навуковых праектаў у галіне культуры, падрыхтоўку кваліфікаваных кадраў; ствараць гарантыі і стымулы мастацкай творчасці, зберажэння традыцыйнай культуры (фальклор, народныя промыслы, рамёствы), выкарыстання дасягненняў культуры; забяспечваць фарміраванне і эстэтызацыю жыццёвага асяроддзя чалавека, абарону інтарэсаў народа Беларусі ў галіне культуры.

Артыкул 6. Абавязкі грамадзян у галіне культуры

Грамадзяне Беларускай ССР абавязаны беражліва адносіцца да гісторыка - культурнай спадчыны Беларусі.

Бацькі, апекуны, папячыцелі ці асобы, якія замяняюць іх, абавязаны клапаціцца аб усебаковым культурным і эстэтычным развіцці і маральным удасканаленні дзяцей.

Артыкул 7. Кампетэнцыя Беларускай ССР у галіне культуры

Веданню Беларускай ССР у асобе яе вышэйшых органаў улады і кіравання ў галіне культуры належыць:

вызначэнне стратэгіі і зацвярджэнне рэспубліканскіх праграм развіцця культуры;

устанаўленне прыярытэтаў і льгот у развіцці культуры;

забеспячэнне развіцця інфраструктуры культуры;

устанаўленне парадку арганізацыі, рэарганізацыі і ліквідацыі прадпрыемстваў і ўстаноў культуры;

устанаўленне навукова абгрунтаваных матэрыяльных і фінансавых норм забеспячэння ўстаноў культуры, нарматываў культурнага абслугоўвання насельніцтва;

забеспячэнне падрыхтоўкі кадраў і павышэнне іх кваліфікацыі, арганізацыя навуковых даследаванняў у галіне культуры;

ажыццяўленне навукова-метадычнага кіраўніцтва прадпрыемствамі і ўстановамі культуры;

ажыццяўленне кантролю за выкананнем заканадаўства аб культуры ўсімі прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі незалежна ад іх ведамаснага падпарадкавання і форм уласнасці;

вырашэнне іншых пытанняў у галіне культуры ў адпаведнасці з заканадаўствам Беларускай ССР.

Кампетэнцыя мясцовых Саветаў народных дэпутатаў у галіне культуры вызначаецца заканадаўствам Беларускай ССР.

Артыкул 8. Прыярытэты ў галіне развіцця культуры

Беларуская ССР вызначае матэрыяльна - фінансавыя прыярытэты:

адраджэнню, зберажэнню, развіццю і распаўсюджванню беларускай нацыянальнай культуры;

стварэнню і папулярызацыі твораў мастацтва і літаратуры для дзяцей, іх эстэтычнай адукацыі і выхаванню;

папулярызацыі класічных твораў айчыннага і сусветнага мастацтва і лепшых узораў сучаснай культуры;

забеспячэнню развіцця культуры ў сельскай мясцовасці, пашырэнню культурнай інфраструктуры вёскі.

Артыкул 9. Мова ў галіне культуры

Мова з'яўляецца універсальным сродкам увасаблення нацыянальнай культуры. Моўная палітыка ў галіне культуры вызначаецца Законам Беларускай ССР «Аб мовах у Беларускай ССР».

Артыкул 10. Правы іншых нацыянальнасцей і этнічных груп у галіне культуры

Асобам любой нацыянальнасці і этнічнай групы, якія пражываюць на тэрыторыі Беларускай ССР, гарантуецца права на развіццё сваёй культуры і мовы, на стварэнне нацыянальнай школы, прадпрыемстваў і ўстаноў культуры (тэатраў, музеяў, выдавецтваў і г. д.).

Грамадзяне Беларускай ССР любой нацыянальнасці і этнічнай групы маюць права на стварэнне культурных аб'яднанняў, асацыяцый, культурна-асветных таварыстваў і суполак, нацыянальных культурных цэнтраў.

Артыкул 11. Фарміраванне эстэтычнага жыццёвага асяроддзя

У Беларускай ССР забяспечваецца стварэнне эстэтычнага жыццёвага асяроддзя шляхам арганічнага спалучэння архітэктурных рашэнняў новых збудаванняў з існуючай забудовай, помнікамі горадабудаўніцтва, архітэктуры і прыроднага ландшафту, выкарыстання нацыянальных традыцый і прыёмаў забудовы, ландшафтнай архітэктуры і іншых мастацкіх сродкаў.

У праект будаўніцтва любога грамадскага комплексу, жылога масіву ці грамадскага будынка ўваходзіць і заданне па іх мастацкаму афармленню, а таксама павінна прадугледжвацца стварэнне прастораў для культурнай дзейнасці і арганізацыі вольнага часу (адпачынку).

Раздзел III. ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА БЕЛАРУСКАЙ ССР

Артыкул 12. Гісторыка-культурная спадчына Беларускай ССР

Да гісторыка - культурнай спадчыны Беларускай ССР належаць матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці, якія маюць нязменнае гістарычнае значэнне для народа Беларусі незалежна ад аўтарскіх, маёмасных правоў на іх, часу іх стварэння і месцазнаходжання, у тым ліку і за межамі Беларускай ССР.

Дзейнасць па зберажэнню і выкарыстанню гісторыка - культурнай спадчыны рэгулюецца Законам Беларускай ССР «Аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры ў Беларускай ССР» і іншымі заканадаўчымі актамі Беларускай ССР.

Артыкул 13. Асаблівасці вывазу культурных каштоўнасцей з тэрыторыі Беларускай ССР

З'яўляецца незаконным вываз з Беларускай ССР і перадача ва ўласнасць замежным дзяржавам, юрыдычным і фізічным асобам культурных і гістарычных каштоўнасцей, якія прызнаны нацыянальным культурным набыткам Беларускай ССР, а таксама:

культурных каштоўнасцей, знойдзеных на тэрыторыі Беларускай ССР, атрыманых археалагічнымі, этнаграфічнымі ці прыродазнаўчымі навуковымі экспедыцыямі;

культурных каштоўнасцей, атрыманых бязвыплатна ці купленых законным чынам з дазволу органаў кіравання культурай Беларускай ССР без права вывазу з тэрыторыі Беларускай ССР.

Вываз іншых культурных каштоўнасцей ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым Саветам Міністраў Беларускай ССР.

Артыкул 14. Вяртанне на тэрыторыю Беларускай ССР культурных каштоўнасцей, незаконна вывезеных за яе межы

У Беларускай ССР праводзіцца дзяржаўная мэтанакіраваная палітыка па вяртанню на радзіму культурных каштоўнасцей, незаконна вывезеных з яе тэрыторыі.

Усе каштоўнасці матэрыяльнай і духоўнай культуры, створаныя на тэрыторыі Беларускай ССР ці законна набытыя Беларускай ССР і яе грамадзянамі, якія былі незаконным чынам вывезены за яе межы, а таксама не вернутыя з эвакуацыі, з'яўляюцца нацыянальным культурным набыткам народа Беларускай ССР і падлягаюць абавязковаму вяртанню на радзіму незалежна ад часу, абставін вывазу і іх цяперашняга месцазнаходжання.

Дзейнасць у гэтым напрамку ажыццяўляецца як дзяржаўнымі органамі, так і грамадскімі арганізацыямі і прыватнымі асобамі.

Парадак гэтай дзейнасці вызначаецца Саветам Міністраў Беларускай ССР на аснове заканадаўства Беларускай ССР, міжнародных актаў і пагадненняў.

Раздзел IV. ПРАДПРЫЕМСТВЫ, УСТАНОВЫ І АРГАНІЗАЦЫІ КУЛЬТУРЫ

Артыкул 15. Тыпы прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый культуры, іх віды і юрыдычныя формы

У Беларускай ССР гарантуецца развіццё разнастайных па тыпах і відах дзейнасці прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый культуры: тэатраў, студый, майстэрань, кінатэатраў, кінаўстановак, канцэртных, мастацкіх і іншых тэатральна - відовішчных і культурна - асветных устаноў, пазашкольных, навучальных, навукова - даследчых і іншых прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый культуры з улікам гістарычных, этнічных і геаграфічных асаблівасцей мясцовасці.

Віды і юрыдычныя формы прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый культуры вызначаюцца Законамі Беларускай ССР «Аб уласнасці ў Беларускай ССР», «Аб прадпрыемствах у Беларускай ССР» і іншымі заканадаўчымі актамі Беларускай ССР.

Артыкул 16. Стварэнне, рэарганізацыя і ліквідацыя прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый культуры

Парадак стварэння, рэарганізацыі і ліквідацыі прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый культуры вызначаецца Саветам Міністраў Беларускай ССР у адпаведнасці з Законамі Беларускай ССР «Аб прадпрыемствах у Беларускай ССР», «Аб уласнасці ў Беларускай ССР» і іншымі заканадаўчымі актамі.

У кожным адміністрацыйна - тэрытарыяльным утварэнні (горадзе, пасёлку, вёсцы) ствараецца грамадска неабходны комплекс прадпрыемстваў і ўстаноў культуры, якія гарантуюць задавальненне духоўных і эстэтычных запатрабаванняў насельніцтва.

Пры праектаванні і будаўніцтве населеных пунктаў, жылых масіваў, прадпрыемстваў і іншых аб'ектаў павінна прадугледжвацца будаўніцтва неабходных устаноў культуры, спартыўных збудаванняў і іншых аб'ектаў сацыяльна-культурнага прызначэння.

Мясцовыя Саветы народных дэпутатаў маюць права ствараць звыш устаноўленых нарматываў любыя прадпрыемствы, установы культуры і творчыя арганізацыі.

Не дапускаецца ліквідацыя прадпрыемстваў і ўстаноў культуры, дзейнасць якіх фінансуецца цалкам ці часткова за кошт сродкаў бюджэту, без стварэння раўнацэнных аб'ектаў культурнага прызначэння на тэрыторыі адміністрацыйна - тэрытарыяльнай адзінкі або жылога комплексу.

У выпадку адмаўлення мясцовага Савета народных дэпутатаў набыць (прыняць на свой баланс) аб'екты культурнага прызначэння ліквідуемага прадпрыемства (установы, арганізацыі) апошняе мае права прадаць (перадаць) гэтыя аб'екты працоўнаму калектыву арганізацыі (установы) культуры ці трэцім асобам. Выкарыстанне такіх устаноў культуры для мэт, не звязаных з культурнай дзейнасцю, без рашэння мясцовага Савета народных дэпутатаў забараняецца.

Не падлягаюць прыватызацыі, ліквідацыі і рэарганізацыі культурныя ўстановы, якія з'яўляюцца нацыянальным культурным набыткам ці маюць вялікую культурную каштоўнасць.

Парадак аднясення культурных устаноў да аб'ектаў, якія не падлягаюць прыватызацыі, ліквідацыі і рэарганізацыі, і іх пералік вызначаецца Саветам Міністраў Беларускай ССР.

Грамадска - дзяржаўныя камісіі рэспублікі (вобласці, пасёлка) праводзяць перыядычную інвентарызацыю і атэстацыю прадпрыемстваў і ўстаноў культуры, іх матэрыяльна - тэхнічных фондаў. Парадак і тэрміны іх правядзення вызначаюцца Саветам Міністраў Беларускай ССР.

Артыкул 17. Узаемасувязі органаў, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый культуры з іншымі органамі, прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі

Дзяржаўныя органы культуры, прадпрыемствы, установы і арганізацыі, творчыя саюзы, грамадскія аб'яднанні ў сферы культуры наладжваюць узаемасувязі з органамі адукацыі, навучальна - выхаваўчымі ўстановамі па пытаннях арганізацыі культурных праграм і мерапрыемстваў, ажыццяўлення эстэтычнага выхавання дзяцей, стварэння ўмоў для асваення духоўных набыткаў беларускага народа.

Дзяржаўныя органы культуры садзейнічаюць развіццю міжнароднага і айчыннага турызму на тэрыторыі Беларускай ССР, удзельнічаюць у арганізацыі турыстычных маршрутаў па гістарычных месцах і ландшафтах рэспублікі і маюць права на атрыманне часткі сродкаў ад даходаў турыстычнага комплексу, якая павінна ісці ў першую чаргу на рэстаўрацыю помнікаў архітэктуры.

Артыкул 18. Грамадскія аб'яднанні ў сферы культуры

Асобам, якія пражываюць на тэрыторыі Беларускай ССР, гарантуецца права аб'ядноўвацца ў любыя грамадскія культурныя арганізацыі і аб'яднанні (творчыя саюзы, таварыствы, суполкі і г. д.) для ажыццяўлення культурнай дзейнасці, не забароненай Законам.

Прававы стан творчых саюзаў, таварыстваў, аб'яднанняў, асацыяцый і іншых грамадскіх фарміраванняў вызначаецца заканадаўствам Беларускай ССР.

Раздзел V. ТВОРЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

Артыкул 19. Традыцыйная культура

Беларуская ССР стварае ўмовы і заахвочвае прадпрыемствы, арганізацыі, установы, грамадзян для адраджэння і развіцця гістарычных традыцый народнай творчасці, аўтэнтычнага фальклору, звычаяў, абрадаў, святаў, традыцыйных промыслаў і рамёстваў, архітэктурных форм нацыянальнага горадабудавання, узораў дэкаратыўна - прыкладнога мастацтва.

Мясцовыя Саветы і органы кіравання культурай забяспечваюць арганізацыйную і фінансавую падтрымку развіцця традыцыйнай культуры і ствараюць умовы для адкрыцця творчых майстэрань і школ народных майстроў.

Артыкул 20. Гарантыі аматарскай творчасці і культурнага адпачынку

Асобы, якія пражываюць на тэрыторыі Беларускай ССР, рэалізуюць гарантаванае Канстытуцыяй Беларускай ССР права на свабоду творчасці і культурнага адпачынку індывідуальна або шляхам стварэння аматарскіх аб'яднанняў і самадзейных калектываў. Аматарскія аб'яднанні і самадзейныя калектывы ствараюцца па ініцыятыве грамадзян, грамадскіх аб'яднанняў, прадпрыемстваў (устаноў, арганізацый), мясцовых Саветаў, органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання па месцы жыхарства ці па месцы работы.

Прадпрыемствы (установы, арганізацыі), грамадскія аб'яднанні, мясцовыя Саветы, органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання павінны садзейнічаць грамадзянам, аматарскім аб'яднанням, самадзейным калектывам і народным майстрам у прадастаўленні памяшканняў, матэрыялаў, абсталявання, зямельных участкаў, у стварэнні неабходных умоў для развіцця творчасці і культурнага адпачынку.

Артыкул 21. Прафесійная творчая дзейнасць

У Беларускай ССР ствараюцца неабходныя ўмовы для творчага развіцця ўсіх відаў прафесійнага мастацтва і літаратуры, архітэктуры і дызайну, работы народных майстроў. Гэта забяспечваецца сістэмай эканамічных, сацыяльных і прававых гарантый: бясплатнасцю атрымання адукацыі і прафесійнай падрыхтоўкі, павышэннем кваліфікацыі, правам свабодна аб'ядноўвацца ў творчыя саюзы (асацыяцыі, таварыствы, суполкі), прыняццем мер па сацыяльнай абароне прафесійных творчых работнікаў.

Артыкул 22. Свабода творчай дзейнасці

У Беларускай ССР усім грамадзянам, калектывам, прадпрыемствам, установам і арганізацыям культуры, у тым ліку маладзёжным культурным цэнтрам, творчым аб'яднанням гарантуецца свабода мастацкай, культурнай дзейнасці, развіццё разнастайных школ і напрамкаў.

Кожны з суб'ектаў творчасці мае права самастойна вызначаць змест, форму, жанр, мову, стыль твора мастацтва і культуры.

Прадпрыемствы і ўстановы культуры, творчыя арганізацыі і калектывы самастойна зацвярджаюць свае творчыя планы і вызначаюць рэпертуарную палітыку, нясуць адказнасць за арганізацыйна-творчую дзейнасць, вызначаную ў адпаведнасці з іх статутамі і палажэннямі.

Крытэрыямі сацыяльнай вартасці твораў мастацтва і культуры з'яўляюцца сцвярджэнне нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей, фарміраванне высокіх грамадзянскіх і маральных якасцей, арыгінальнасць, высокі мастацкі і эстэтычны ўзровень гэтых твораў.

Артыкул 23. Сацыяльна-творчыя заказы

Для вырашэння пэўных культурных задач, стымулявання творчага пошуку органы кіравання культурай маюць права даваць мэтавыя творчыя заказы (у тым ліку на конкурснай аснове), прадпрыемствам, установам, арганізацыям культуры, творчым калектывам, дзеячам культуры і мастацтва з іх згоды на стварэнне новых твораў мастацтва (тэатральнага, музычнага, харэаграфічнага, выяўленчага, манументальнага, дэкаратыўна-прыкладнога, кіно, архітэктуры), канцэртных праграм і аказанне культурных паслуг.

Сацыяльна-творчыя заказы могуць рабіцца юрыдычнымі асобамі на правядзенне фестываляў, выставак, конкурсаў, дзён культуры, дэкад, тэатралізаваных свят і прадстаўленняў, культурнае абслугоўванне працоўных калектываў і іншыя віды творчых мерапрыемстваў.

Віды творчых і сацыяльных заказаў не могуць быць абмежаваны.

Раздзел VI. РАСПАЎСЮДЖВАННЕ І ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ ТВОРАЎ МАСТАЦТВА І КУЛЬТУРЫ

Артыкул 24. Свабода распаўсюджвання і папулярызацыі твораў мастацтва і культуры

Прадпрыемствы і ўстановы мастацтва і культуры самастойныя ў вызначэнні творчых праграм і выбары рэпертуару і маюць права папулярызаваць і распаўсюджваць творы мастацтва і культуры розных жанраў, форм і стыляў.

Стымулюецца папулярызацыя і распаўсюджванне беларускага нацыянальнага мастацтва і культуры, узораў класічнага і сучаснага сусветнага мастацтва, у тым ліку шляхам фінансавання і падатковай палітыкі.

Забараняецца распаўсюджванне твораў, якія заклікаюць да гвалтоўнага звяржэння ці змянення канстытуцыйнага дзяржаўнага ладу, прапагандуюць вайну, насілле і жорсткасць, расавую, нацыянальную, рэлігійную варожасць, парнаграфію.

Службовыя асобы ці органы ўлады не маюць права без адпаведнай матывацыі прымаць рашэнне аб забароне, абмежаванні ці прыпыненні культурных акцый, экспанаванні, публікацыі, выкананні твораў мастацтва ці іншага прадукта культурнай дзейнасці, прызначанага для публічнага паказу ці распаўсюджвання. У выпадку, калі культурныя акцыі прыпынены ці абмежаваны, зацікаўленыя асобы маюць права абскардзіць рашэнне службовай асобы ці органа кіравання ў судовым парадку.

Яны маюць таксама права патрабаваць кампенсацыю за прычыненыя страты. Парадак забароны, абмежавання ці прыпынення культурнай акцыі на тэрыторыі Беларускай ССР вызначаецца Саветам Міністраў Беларускай ССР.

Артыкул 25. Гастролі творчых калектываў і выканаўцаў

Кожны творчы калектыў і выканаўца мае права праводзіць у любы час у любым населеным пункце Беларускай ССР гастролі па прамых сувязях на аснове дагавораў з дзяржаўнымі органамі мясцовага самакіравання, прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі.

Замежныя гастролі праводзяцца творчымі калектывамі і асобнымі выканаўцамі на аснове кантрактаў (дагавораў). Калектыў ці выканаўца нясе поўную адказнасць за захаванне ўмоў кантракта (дагавора) і самастойна вызначае свой рэпертуар. Парадак ліцэнзавання замежных гастроляў вызначаецца Саветам Міністраў Беларускай ССР.

Артыкул 26. Гарантыі і кампенсацыі аматарскім аб'яднанням і самадзейным калектывам

Аматарскія аб'яднанні і самадзейныя калектывы ў выпадку іх згоды могуць на дагаворнай аснове прыцягвацца да выканання сацыяльна-творчых заказаў, выдаваемых органамі кіравання культурай.

Заказчыкі абавязаны кампенсаваць усе выдаткі аматарскіх аб'яднанняў і самадзейных калектываў (гэтак жа і самастойных удзельнікаў), звязаных з выкананнем заказу, а таксама выплаціць удзельнікам сярэднюю заработную плату за ўсе дні адсутнасці іх на асноўнай рабоце.

Заказчык абавязаны за свой кошт застрахаваць удзельнікаў ад няшчасных выпадкаў, а маёмасць калектываў і самастойных удзельнікаў — ад псавання і знішчэння.

Артыкул 27. Мастацкія выстаўкі

У Беларускай ССР ствараюцца неабходныя матэрыяльныя і арганізацыйна-прававыя перадумовы для правядзення мастацкіх выставак. Мясцовыя Саветы народных дэпутатаў, прадпрыемствы, установы, грамадскія аб'яднанні, у тым ліку і творчыя саюзы, абавязаны садзейнічаць у арганізацыі і правядзенні мастацкіх выставак.

Парадак стварэння выставачных залаў, карцінных галерэй, павільёнаў, якія знаходзяцца на гаспадарчым разліку, вызначаецца Законам Беларускай ССР «Аб прадпрыемствах у Беларускай ССР». Усе камерцыйныя выстаўкі арганізоўваюцца і праводзяцца на падставе дагавораў.

Мясцовыя Саветы разам з творчымі саюзамі вызначаюць парадак правядзення мастацкіх выставак (у тым ліку і на адкрытых пляцоўках).

Артыкул 28. Кіна- і відэапракат

Для ажыццяўлення пракату і дэманстрацыі кіна- і відэафільмаў у Беларускай ССР ствараюцца прадпрыемствы і ўстановы кіна-, відэапракату і кіна-, відэасеткі, якія дзейнічаюць на аснове Закона Беларускай ССР «Аб прадпрыемствах у Беларускай ССР».

Права юрыдычных і фізічных асоб на стварэнне і дзейнасць прадпрыемстваў кіна-, відэапракату, а таксама кінатэатраў, кінаўстановак, відэазалаў, відэасалонаў рэалізуецца ў парадку, вызначаным заканадаўствам Беларускай ССР.

Прадпрыемствы, установы кіна-, відэапракату, кінатэатры, відэаўстаноўкі, відэазалы, відэасалоны рэгіструюцца мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў у парадку, вызначаным заканадаўствам Беларускай ССР.

Артыкул 29. Выдавецкая дзейнасць

У Беларускай ССР гарантуецца свабода выдавецкай дзейнасці і распаўсюджвання друкаванай прадукцыі ў адпаведнасці з заканадаўствам Беларускай ССР.

Дзяржаўныя органы маюць права выдаваць дзяржаўны заказ на выпуск друкаванай прадукцыі па прыярытэтных напрамках: творы нацыянальнай тэматыкі, класічнай літаратуры і культуры, кнігі для дзяцей, вучэбная класічная і дзіцячая літаратура, кнігі на экспарт.

Артыкул 30. Архівы

Дзейнасць архіваў у Беларускай ССР вызначаецца адпаведным заканадаўствам Беларускай ССР.

Артыкул 31. Палацы (дамы) культуры, клубы, паркі і іншыя культурна-асветныя ўстановы

Для арганізацыі культурна-асветнай дзейнасці, эстэтычнага выхавання і забеспячэння адпачынку насельніцтва, паўнацэннага выкарыстання вольнага часу ў Беларускай ССР гарантуецца развіццё разнастайных па тыпах і відах устаноў: палацаў (дамоў) культуры, клубаў, паркаў культуры і адпачынку, маладзёжных культурных цэнтраў і іншых. Дзейнасць культурна-асветных устаноў рэгулюецца адпаведным заканадаўствам Беларускай ССР.

Артыкул 32. Эстэтычная і мастацкая асвета

Дзяржаўныя органы культуры, сродкі (органы) інфармацыі, творчыя саюзы сумесна з органамі народнай адукацыі садзейнічаюць развіццю мастацкай крытыкі і іншых форм аб'ектыўнай ацэнкі культурных працэсаў, садзейнічаюць эстэтычнай асвеце грамадзян, стварэнню грамадскіх асацыяцый (цэнтраў) па вывучэнню тэорыі і гісторыі айчыннай і сусветнай культуры, папулярызацыі мастацтва.

Артыкул 33. Бібліятэкі

Беларуская ССР стварае і забяспечвае дзейнасць сеткі дзяржаўных бібліятэк і бібліятэк грамадскіх арганізацый, ведамстваў, устаноў і прадпрыемстваў.

Гарантуецца развіццё і дзейнасць кааператыўных і прыватных бібліятэк.

Мясцовыя Саветы народных дэпутатаў, ведамствы, грамадскія аб'яднанні, установы, прадпрыемствы, якія маюць сетку бібліятэк, гарантуюць іх фінансаванне, матэрыяльна-тэхнічнае і кадравае забеспячэнне, ствараюць неабходныя ўмовы для захавання і выкарыстання бібліятэчных фондаў, абслугоўвання наведвальнікаў і абанентаў па існуючых нарматывах.

Дзейнасць бібліятэк у Беларускай ССР вызначаецца адпаведным заканадаўствам Беларускай ССР.

Артыкул 34. Музеі

Беларуская ССР забяспечвае збор, сістэматызацыю і вывучэнне прадметаў і аб'ектаў нацыянальнай культурнай спадчыны Беларусі і іншага культурнага набытку Беларускай ССР, заахвочваючы дзейнасць разнастайных дзяржаўных, грамадскіх, кааператыўных і прыватных музеяў (мастацкіх, краязнаўчых, гістарычных, археалагічных, этнаграфічных, народнага мастацтва і іншых).

Беларуская ССР стварае нацыянальныя музеі, якія з'яўляюцца захавальнікамі асабліва каштоўных фондаў нацыянальнай культурнай спадчыны Беларусі і іншага культурнага набытку Беларускай ССР і выконваюць ролю навуковых, культурна-асветных і метадычных цэнтраў музейнай справы ў рэспубліцы. Нацыянальныя музеі Беларускай ССР валодаюць правам набыцця і захавання прадметаў і аб'ектаў нацыянальнай культурнай спадчыны Беларусі, якія знаходзяцца ва ўласнасці дзяржавы або пераходзяць у яе ўласнасць.

Прадметы і аб'екты нацыянальна-культурнай спадчыны з дзяржаўных фондаў і музеяў не могуць перадавацца на захаванне, для выкарыстання па функцыянальнай прыналежнасці і для экспанавання прыватным асобам у кааператыўныя, прыватныя і іншыя зборы, а таксама любым юрыдычным асобам, якія не маюць статуса музеяў, акрамя асобных выпадкаў, па якіх прымаецца спецыяльнае рашэнне органаў кіравання ў галіне культуры.

На тэрыторыі Беларускай ССР ствараюцца і дзейнічаюць запаведнікі прыроды, гісторыка-культурныя і археалагічныя запаведнікі, на якія распаўсюджваюцца палажэнні дадзенага артыкула. Асаблівасці прававога статуса музеяў, гісторыка-культурных і археалагічных запаведнікаў вызначаюцца спецыяльным заканадаўствам Беларускай ССР.

Дзяржаўныя органы выдзяляюць у прыярытэтным парадку неабходныя матэрыяльныя і фінансавыя сродкі для камплектавання, кансервацыі і рэстаўрацыі музейных фондаў, капіравання унікальных узораў, забяспечваюць нарматыўныя ўмовы работы музеяў, стварэнне экспазіцый і выставак, садзейнічаюць вяртанню ў выглядзе арыгіналаў ці копій мастацкіх і гістарычных каштоўнасцей, вывезеных за мяжу.

Музеі не радзей аднаго разу на тыдзень прадастаўляюць грамадзянам, вучням, студэнтам, навучэнцам ПТВ і сярэдніх спецыяльных устаноў магчымасць бясплатнага наведвання залаў і агляду калекцый і фондаў.

Парадак стварэння, набыцця, рэарганізацыі, экспанавання, захоўвання прадметаў і аб'ектаў нацыянальна-культурнай спадчыны Беларускай ССР і іншых экспанатаў, а таксама пытанні дзейнасці музеяў незалежна ад іх ведамаснага падпарадкавання рэгулююцца заканадаўствам Беларускай ССР.

Артыкул 35. Пазашкольныя ўстановы культуры

Беларуская ССР стварае і забяспечвае дзейнасць пазашкольных устаноў культуры па месцы жыхарства грамадзян рэспублікі.

Дзяржаўныя органы сумесна з мясцовымі Саветамі гарантуюць выдзяленне (здачу ў арэнду) неабходных памяшканняў, забеспячэнне па ліміта́х і дзяржаўных цэнах рэсурсаў і матэрыяльна-тэхнічных сродкаў, неабходных для работы пазашкольных устаноў культуры незалежна ад ведамаснай прыналежнасці.

Раздзел VII. ФІНАНСАВАННЕ І МАТЭРЫЯЛЬНА-ТЭХНІЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ КУЛЬТУРЫ

Артыкул 36. Крыніцы і парадак фінансавання культуры

Для фінансавання культуры ствараецца рэспубліканскі фонд фінансавання культуры, а таксама фонды фінансавання культуры мясцовых Саветаў народных дэпутатаў.

Крыніцамі фарміравання фондаў фінансавання культуры з'яўляюцца:

дабрачынныя паступленні ад прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый усіх відаў уласнасці, прыбыткі ад правядзення спецыяльных латарэй, аўкцыёнаў, выставак;

дабрачынныя паступленні ад грамадскіх арганізацый і ад грамадзян;

паступленні ад продажу і набыцця каштоўных папер, якія выпускаюцца фондам.

Дзяржава ўстанаўлівае гарантаваную долю бюджэтных сродкаў на развіццё мастацтва і культуры ў размеры не меней 3 працэнтаў ад агульнай сумы Дзяржаўнага бюджэту Беларускай ССР.

Для фінансавання відаў мастацтва і напрамкаў культурнай дзейнасці ў складзе фондаў фінансавання культуры могуць стварацца спецыяльныя фонды (тэатра, музыкі, кіно, выяўленчага мастацтва і іншыя). Размеркаванне сродкаў фонду фінансавання культуры ажыццяўляецца ў адпаведнасці з палажэннем аб фондзе, якое зацвярджаецца Саветам Міністраў Беларускай ССР. Дзейнасць фондаў фінансавання культуры мясцовых Саветаў народных дэпутатаў зацвярджаецца адпаведнымі мясцовымі Саветамі.

Артыкул 37. Выкарыстанне фондаў фінансавання культуры

Выкарыстанне сродкаў фондаў фінансавання культуры ажыццяўляецца па рашэнню праўлення фондаў культуры ў адпаведнасці з палажэннямі аб гэтых фондах.

Артыкул 38. Фінансаванне культуры з бюджэту мясцовых Саветаў

Мясцовыя Саветы народных дэпутатаў забяспечваюць развіццё культуры і культурнае абслугоўванне насельніцтва на падставе ўстаноўленых у Беларускай ССР нарматываў і гарантаваных бюджэтных асігнаванняў.

У адпаведнасці з Законам Беларускай ССР «Аб мясцовым самакіраванні і мясцовай гаспадарцы ў Беларускай ССР», бюджэтным і падатковым заканадаўствам Беларускай ССР мясцовыя Саветы народных дэпутатаў маюць права самастойна вызначаць звыш устаноўленых нарматываў памер бюджэтнага фінансавання ўстаноў культуры, размешчаных на сваёй тэрыторыі, незалежна ад іх ведамаснай прыналежнасці.

Артыкул 39. Добраахвотныя фонды развіцця культуры

Грамадскія арганізацыі, прафсаюзы, творчыя саюзы, іншыя грамадскія аб'яднанні, прадпрыемствы, установы, арганізацыі і грамадзяне маюць права самастойна ці на дагаворнай аснове ствараць фонды для фінансавання культурна-асветных устаноў, культурных праграм, развіцця мастацтва, літаратуры, выяўлення і падтрымкі творчых талентаў, інавацыйных пачынанняў у культуры, вырашэння сацыяльных і бытавых пытанняў творчых работнікаў. Арганізацыя і дзейнасць указаных фондаў ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з іх статутамі. У якасці заснавальнікаў фондаў могуць выступаць на парытэтных пачатках дзяржаўныя органы і органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання.

Артыкул 40. Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне культуры

Прадпрыемствам, установам культуры, арганізацыям і творчым калектывам незалежна ад іх ведамаснай прыналежнасці гарантуецца прыярытэтнае забеспячэнне неабходным інвентаром, музычнымі інструментамі, абсталяваннем і іншымі матэрыяльна-тэхнічнымі сродкамі. Першачарговым правам матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння карыстаюцца прадпрыемствы, установы культуры сельскай мясцовасці, а таксама тыя, што працуюць з дзецьмі і падлеткамі.

У Беларускай ССР стымулюецца фінансаванне і матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне

(Заканчэнне на 4-й стар.).

Народная газета

Закон Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі

АБ КУЛЬТУРЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ ССР

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

культуры з боку прафсаюзаў, грамадскіх арганізацый, творчых саюзаў, прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый і асобных грамадзян.

Мясцовыя Саветы абавязаны прадугледжваць выдзяленне творчым работнікам у пастаяннае карыстанне часткі нежылога фонду пад майстэрні, студыі, лабараторыі, залы і г. д., неабходныя для ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці. Забараняецца перадача гэтых памяшканняў другім асобам, а таксама выкарыстанне іх у іншых мэтах. Размер арэнднай платы за гэтыя памяшканні ўстанаўліваецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Беларускай ССР.

Артыкул 41. Забеспячэнне развіцця культуры ў сельскай мясцовасці

У Беларускай ССР забяспечваецца прыярытэт у развіцці культуры ў сельскай мясцовасці, фарміраванне сеткі прадпрыемстваў і ўстаноў культуры, стварэнне ўмоў для эстэтычнай адукацыі і культурнага абслугоўвання насельніцтва на ўзроўні, які вызначаны патрабаваннямі агульнадзяржаўных праграм; стымулюецца адраджэнне традыцыйных узораў народнай творчасці.

Праектаванне і будаўніцтва ўстаноў культуры ў сельскай мясцовасці фінансуецца за кошт дзяржаўных сродкаў або арганізацыямі і ўстановамі, якія вядуць будаўніцтва, затрачаныя грашовыя сродкі ў аб'ёме праектнага каштарысу кампенсуюцца.

Раздзел VIII. ПАДАТКІ, ІЛЬГОТЫ ПА ПАДАТКААБКЛАДАННЮ

Артыкул 42. Парадак выплаты і размеры падатку на прыбытак

Парадак і размеры падаткаабкладання прыбытку прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў культуры вызначаюцца падатковым заканадаўствам Беларускай ССР.

Артыкул 43. Ільготы па падатку на прыбытак

Дзяржава стымулюе накіраванне сродкаў на фінансаванне культуры, выкарыстоўваючы метады эканамічнага рэгулявання і льготнага падаткаабкладання.

Вызваляюцца ад падатку на прыбытак:

а) прадпрыемствы, арганізацыі і ўстановы культуры, выдаткі па ўтрыманню якіх поўнасцю пакрываюцца за кошт рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў або якія атрымліваюць дзяржаўныя датацыі з бюджэту;

б) прыбытак гаспадарча-разліковых прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый, зарэгістраваных на тэрыторыі рэспублікі творчых саюзаў, Беларускага фонду культуры, аб'яднання беларусаў свету «Бацькаўшчына», Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны, Беларускага ПЭН-цэнтра, накіраваны імі названым саюзам, фондам, таварыствам на ажыццяўленне іх статутнай дзейнасці;

в) сума прыбытку, пералічаная зарэгістраваным на тэрыторыі Беларускай ССР Беларускаму добраахвотнаму таварыству аховы помнікаў гісторыі і культуры, Нацыянальнаму фонду адукацыі і культуры Беларускай ССР, рэспубліканскаму і мясцовым фондам развіцця культуры, Таварыству беларускай мовы імя Ф. Скарыны, аб'яднанню беларусаў свету «Бацькаўшчына», а таксама пералічаная прадпрыемствам, арганізацыям і ўстановам культуры — у межах, вызначаных заканадаўствам Беларускай ССР па падаткаабкладанню.

Падатковым заканадаўствам Беларускай ССР могуць устанаўлівацца іншыя льготы па падаткаабкладанню прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый культуры, уключаючы арганізацыі, якія займаюцца рамонтам, рэстаўрацыяй і рэканструкцыяй помнікаў гісторыі.

Раздзел IX. АПЛАТА ПРАЦЫ І САЦЫЯЛЬНЫЯ ГАРАНТЫІ РАБОТНІКАМ КУЛЬТУРЫ

Артыкул 44. Гарантыі аплаты працы работнікам культуры

Дзяржава забяспечвае гарантаваны ўзровень аплаты працы і яе дыферэнцыяцыю ў залежнасці ад кваліфікацыі і вынікаў працы.

Максімальная велічыня заработнай платы не абмяжоўваецца і ўстанаўліваецца ў адпаведнасці з якасцю, колькасцю і відам працы ў межах сродкаў, накіраваных у фонд заработнай платы (аплаты працы).

Артыкул 45. Падаткаабкладанне аўтарскіх ганарараў

Аўтарскія ганарары за творы мастацтва і культуры падлягаюць падаткаабкладанню згодна з заканадаўствам Беларускай ССР.

Артыкул 46. Абарона аўтарскіх правоў

У Беларускай ССР гарантуецца захаванне і абарона аўтарскіх правоў.

Парадак абароны аўтарскіх правоў устанаўліваецца заканадаўствам Беларускай ССР у адпаведнасці з міжнароднымі канвенцыямі па аўтарскаму праву.

Раздзел X. ПАДРЫХТОЎКА, ПЕРАПАДРЫХТОЎКА, АТЭСТАЦЫЯ КАДРАЎ

Артыкул 47. Падрыхтоўка, перападрыхтоўка і атэстацыя кадраў

Падрыхтоўка прафесійных работнікаў культуры і мастацтва ажыццяўляецца ў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных і іншых навучальных установах культуры і мастацтва.

Падрыхтоўка кадраў у галіне эстэтычнага і мастацкага выхавання для дашкольных, пазашкольных і навучальных устаноў і сферы адпачынку забяспечваецца дзяржзаказам.

Дзяржаўнымі органамі культуры ствараюцца неабходныя ўмовы для перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі работнікаў культуры і мастацтва ў розных формах і напрамках.

У Беларускай ССР могуць адкрывацца прыватныя навучальныя ўстановы мастацтва і культуры.

Грамадзяне, якія маюць спецыяльную адукацыю ў галіне культуры і мастацтва, карыстаюцца пераважным правам працаўладкавання па спецыяльнасці.

Усе работнікі культуры, кіраўнікі дзяржаўных органаў, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый культуры праходзяць перыядычную атэстацыю.

Дзяржаўныя органы кіравання, прадпрыемствы, установы і арганізацыі культуры, творчыя саюзы і іншыя грамадскія аб'яднанні садзейнічаюць у падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы кадраў работнікаў мастацтва і культуры за мяжой, а таксама замежных грамадзян, у першую чаргу прадстаўнікоў беларускіх суполак, у навучальных установах Беларускай ССР.

Раздзел XI. ПРАВЫ ЗАМЕЖНЫХ ГРАМАДЗЯН І АСОБ БЕЗ ГРАМАДЗЯНСТВА

Артыкул 48. Правы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства

Замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія жывуць на тэрыторыі Беларускай ССР, маюць права на мастацкую творчасць і карыстанне дасягненнямі культуры ў Беларускай ССР нароўні з грамадзянамі Беларускай ССР у адпаведнасці з парадкам, устаноўленым заканадаўствам Беларускай ССР і міжнароднымі дагаворамі Беларускай ССР.

Раздзел XII. ЗНЕШНІЯ СУВЯЗІ

Артыкул 49. Знешнія сувязі

Беларускай ССР належыць выключнае права ўстанаўліваць і развіваць знешнія культурныя сувязі. Яна мае права заключаць міжнародныя дагаворы і пагадненні ў галіне культуры, ажыццяўляць узаемны абмен дасягненнямі культуры.

Прадпрыемствы, установы і арганізацыі культуры, грамадскія аб'яднанні, у тым ліку і творчыя саюзы, маюць права самастойна заключаць дагаворы (кантракты) з замежнымі юрыдычнымі і фізічнымі асобамі на любыя формы супрацоўніцтва ў сферы культуры. Абмежаванні на міжнароднае культурнае супрацоўніцтва могуць быць устаноўлены толькі заканадаўчымі актамі Беларускай ССР.

Калі міжнароднымі дагаворамі ці міжнароднымі пагадненнямі, у якіх удзельнічае Беларуская ССР, вызначаюцца іншыя правілы, чым тыя, якія вызначаны заканадаўствам Беларускай ССР аб культуры, тады прымяняюцца правілы міжнародных дагавораў ці міжнародных пагадненняў.

Раздзел XIII. АДКАЗНАСЦЬ ЗА ПАРУШЭННІ ЗАКАНАДАЎСТВА Ў СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ

Артыкул 50. Адказнасць за парушэнні заканадаўства ў сферы культуры

Заканадаўствам Беларускай ССР устанаўліваецца крымінальная, адміністрацыйная, дысцыплінарная, матэрыяльная адказнасць за правапарушэнні ў сферы культуры.

Маёмасная і маральная шкода, якая нанесена грамадству і грамадзянам у сферы культуры, пакрываецца вінаватымі па рашэнню судоў у адпаведнасці з заканадаўствам Беларускай ССР.

Старшыня Вярхоўнага Савета Беларускай ССР М. ДЗЕМЯНЦЕЙ.

4 чэрвеня 1991 г.
гор. Мінск.

Пастанова Вярхоўнага Савета Беларускай ССР

АБ ПАРАДКУ ЎВЯДЗЕННЯ Ў ДЗЕЯННЕ ЗАКОНА БЕЛАРУСКАЙ ССР «АБ КУЛЬТУРЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ ССР»

Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі **пастанаўляе:**

1. Увесці ў дзеянне Закон Беларускай ССР «Аб культуры ў Беларускай ССР» з моманту яго апублікавання ў друку, а артыкул 35, раздзелы VIII і IX Закона — з 1 студзеня 1992 года.

2. Устанавіць, што надалей да прывядзення заканадаўства Беларускай ССР у адпаведнасць з Законам Беларускай ССР «Аб культуры ў Беларускай ССР» прымяняецца дзеючае заканадаўства, паколькі яно не супярэчыць гэтаму Закону.

3. Савету Міністраў Беларускай ССР да 1 студзеня 1992 года:

— прадставіць у Вярхоўны Савет Беларускай ССР прапановы аб прывядзенні заканадаўчых актаў Беларускай ССР у адпаведнасць з Законам Беларускай ССР «Аб культуры ў Беларускай ССР»;

— прывесці рашэнні ўрада Беларускай ССР у адпаведнасць з Законам Беларускай ССР «Аб культуры ў Беларускай ССР»;

— забяспечыць перагляд і адмену міністэрствамі, дзяржаўнымі камітэтамі і ведамствамі Беларускай ССР іх нарматыўных актаў, у тым ліку інструкцый, якія супярэчаць названаму Закону.

Старшыня Вярхоўнага Савета Беларускай ССР М. ДЗЕМЯНЦЕЙ.

4 чэрвеня 1991 г., г. Мінск.

Закон Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі

АБ ГАСПАДАРЧЫМ СУДЗЕ Ў БЕЛАРУСКАЙ ССР

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 1. Гаспадарчы суд

Гаспадарчы суд у Беларускай ССР з'яўляецца органам, які ажыццяўляе ў межах сваёй кампетэнцыі правасуддзе ў галіне эканамічных адносін паміж прадпрыемствамі, установамі, арганізацыямі незалежна ад форм уласнасці і відаў гаспадарчай дзейнасці, дзяржаўнымі і грамадскімі органамі і арганізацыямі (у далейшым называюцца прадпрыемствы і арганізацыі).

Артыкул 2. Задачы гаспадарчага суда

Задачамі гаспадарчага суда ў Беларускай ССР з'яўляюцца:

забеспячэнне абароны правоў і інтарэсаў прадпрыемстваў і арганізацый, што ахоўваюцца законам, незалежна ад форм уласнасці шляхам ажыццяўлення правасуддзя;

садзейнічанне прававымі сродкамі выкананню заканадаўства ў эканамічных адносінах;

забеспячэнне аднастайнага і правільнага прымянення заканадаўства пры вырашэнні гаспадарчых спрэчак;

папярэджванне парушэнняў законнасці ў эканамічных адносінах і дагаворных абавязацельстваў;

падрыхтоўка прапаноў аб удасканаленні гаспадарчага заканадаўства.

Артыкул 3. Заканадаўчыя акты аб арганізацыі, парадку дзейнасці і кампетэнцыі гаспадарчага суда

Арганізацыя, парадак дзейнасці і кампетэнцыя гаспадарчага суда ў Беларускай ССР вызначаюцца гэтым Законам і іншымі заканадаўчымі актамі Беларускай ССР.

Парадак і тэрміны вырашэння гаспадарчых спрэчак гаспадарчымі судамі ўстанаўліваюцца Гаспадарчым працэсуальным кодэксам Беларускай ССР.

Асаблівасці вырашэння асобных відаў спрэчак могуць устанаўлівацца заканадаўчымі актамі Беларускай ССР.

Артыкул 4. Заканадаўства, якім кіруецца гаспадарчы суд у сваёй дзейнасці

Гаспадарчы суд у Беларускай ССР у сваёй дзейнасці кіруецца Канстытуцыяй Беларускай ССР, законамі Беларускай ССР і Саюза ССР, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Беларускай ССР, Саюзным дагаворам, пагадненнямі і дагаворамі Беларускай ССР з іншымі рэспублікамі, іншымі заканадаўчымі і нарматыўнымі актамі.

Гаспадарчы суд у сваёй дзейнасці незалежны і падпарадкоўваецца толькі закону.

II. АРГАНІЗАЦЫЯ ГАСПАДАРЧАГА СУДА

Артыкул 5. Сістэма гаспадарчага суда

У Беларускай ССР дзейнічаюць гаспадарчыя суды:

Вышэйшы Гаспадарчы Суд Беларускай ССР;

гаспадарчыя суды абласцей.

Вышэйшы Гаспадарчы Суд Беларускай ССР і гаспадарчыя суды абласцей складаюць адзіную сістэму гаспадарчых судоў у Беларускай ССР.

Прэзідыум Вярхоўнага Савета Беларускай ССР па прадстаўленню Старшыні Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларускай ССР можа ўтвараць гаспадарчыя суды ў гарадах.

Артыкул 6. Кіраўніцтва гаспадарчымі судамі ў Беларускай ССР

Сістэму гаспадарчых судоў у Беларускай ССР узначальвае Вышэйшы Гаспадарчы Суд Беларускай ССР, які нясе адказнасць за арганізацыю, стан і ўдасканаленне дзейнасці гаспадарчых судоў у Беларускай ССР па ажыццяўленню правасуддзя.

Вышэйшы Гаспадарчы Суд Беларускай ССР ажыццяўляе праверку дзейнасці гаспадарчых судоў і заслухоўвае іх справаздачы, вывучае, абагульняе і распаўсюджвае станоўчы вопыт работы.

Вышэйшы Гаспадарчы Суд Беларускай ССР не радзей аднаго разу ў год прадстаўляе інфармацыю Вярхоўнаму Савету Беларускай ССР аб дзейнасці гаспадарчых судоў у Беларускай ССР.

Артыкул 7. Паўнамоцтвы старшыні гаспадарчага суда

Старшыня гаспадарчага суда ўзначальвае гаспадарчы суд, кіруе дзейнасцю гаспадарчага суда, выдае на падставе і ў мэтах выканання заканадаўства загады, абавязковыя для работнікаў гаспадарчага суда, якім ён кіруе, зацвярджае палажэнні аб структурных падраздзяленнях, назначае на пасаду і вызваляе ад пасады работнікаў (акрамя тых работнікаў, якія ў адпаведнасці з гэтым Законам назначаюцца і і вызваляюцца ў іншым парадку), прымяняе ва ўстаноўленым парадку меры заахвочвання і спагнання да работнікаў гаспадарчага суда, а таксама выконвае іншыя функцыі, прадугледжаныя заканадаўчымі актамі, што рэгулююць дзейнасць гаспадарчага суда.

Старшыня Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларускай ССР ажыццяўляе кіраванне работай па падбору, расстаноўцы і выхаванню кадраў у гаспадарчых судах Беларускай ССР, выдае загады, абавязковыя для работнікаў Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларускай ССР, а таксама для работнікаў гаспадарчых судоў абласцей.

Старшыня Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларускай ССР нясе адказнасць за выкананне задач, ускладзеных на гаспадарчыя суды ў рэспубліцы.

Артыкул 8. Выбранне Старшыні Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларускай ССР і намеснікаў Старшыні Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларускай ССР

Старшыня Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларускай ССР выбіраецца на пасаду Вярхоўным Саветам Беларускай ССР па прадстаўленню Старшыні Вярхоўнага Савета Беларускай ССР бестэрмінова.

Старшыня Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларускай ССР мае аднаго першага намесніка і намеснікаў.

Першы намеснік і намеснікі Старшыні Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларускай ССР выбіраюцца на пасаду Вярхоўным Саветам Беларускай ССР па прадстаўленню Старшыні Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларускай ССР бестэрмінова.

Артыкул 9. Назначэнне суддзяў Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларускай ССР

Суддзі Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларускай ССР назначаюцца бестэрмінова Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР па прадстаўленню Старшыні Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларускай ССР.

Артыкул 10. Назначэнне старшыні гаспадарчага суда вобласці і намесніка старшыні гаспадарчага суда вобласці

Старшыня гаспадарчага суда вобласці і яго намеснік назначаюцца на пасаду Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР па прадстаўленню Старшыні Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларускай ССР бестэрмінова.

Артыкул 11. Назначэнне суддзяў гаспадарчага суда вобласці

Суддзя гаспадарчага суда вобласці назначаецца Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР па прадстаўленню Старшыні Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларускай ССР бестэрмінова.

Артыкул 12. Вызваленне суддзяў ад пасады

Старшыні гаспадарчых судоў, іх намеснікі і суддзі вызваляюцца ад пасады адпаведна Вярхоўным Саветам Беларускай ССР або Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР:

у выпадку здзяйснення імі ганебнага ўчынку, несумяшчальнага з іх званнем, а таксама пры ўступленні ў сілу абвінаваўчага прыгавору суда, які адбыўся ў адносінах да іх;

па стану здароўя, што перашкаджае працягу работы;

у выніку выбрання на іншую пасаду або пераводу з іх згоды на іншую работу;

па ўласнаму жаданню;

па дасягненні 65-гадовага ўзросту.

Артыкул 13. Права заканадаўчай ініцыятывы Старшыні Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларускай ССР

Старшыні Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларускай ССР належыць права заканадаўчай ініцыятывы ў Вярхоўным Савеце Беларускай ССР.

Артыкул 14. Удзел Старшыні Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларускай ССР і яго намеснікаў, старшыні гаспадарчага суда вобласці і яго намесніка ў пасяджэннях органаў дзяржаўнай улады і кіравання

Старшыня Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларускай ССР, яго намеснікі маюць права прымаць удзел у пасяджэннях Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, Савета Міністраў Беларускай ССР і яго Прэзідыума, іншых выканаўчых органаў улады і кіравання з правам дарадчага голасу.

Старшыня гаспадарчага суда вобласці і яго намеснік маюць права прымаць удзел у рабоце сесій мясцовых Саветаў народных дэпутатаў вобласці і іх выканаўчых камітэтаў з правам дарадчага голасу.

Артыкул 15. Суддзя гаспадарчага суда ў Беларускай ССР

Суддзя вырашае спрэчкі паміж прадпрыемствамі і арганізацыямі і забяспечвае абарону іх правоў.

Вырашаючы гаспадарчыя спрэчкі, суддзя вядзе работу па прадухіленню парушэнняў законнасці ў эканамічнай сферы, вывучае і абагульняе практыку вырашэння спрэчак, распрацоўвае прапановы па ўдасканаленню заканадаўства і вядзе прапаганду гаспадарчага заканадаўства.

Суддзёй можа быць грамадзянін Беларускай ССР, які дасягнуў 25 гадоў і мае вышэйшую юрыдычную адукацыю.

Суддзі ў парадку, устаноўленым Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, праходзяць атэстацыю, па выніках якой ім, з улікам кваліфікацыі і вопыту работы, прысвойваюцца кваліфікацыйныя класы.

Артыкул 16. Правы суддзі гаспадарчага суда пры падрыхтоўцы і вырашэнні гаспадарчай спрэчкі

Суддзя валодае паўнамоцтвамі, неабходнымі для ажыццяўлення сваёй дзейнасці, якая вызначаецца гэтым Законам і Гаспадарчым працэсуальным кодэксам Беларускай ССР.

Суддзя мае права:

патрабаваць ад дзяржаўных і іншых органаў, прадпрыемстваў і арганізацый, а таксама службовых асоб дакументы і іншыя доказы, неабходныя для вырашэння гаспадарчай спрэчкі;

назначаць экспертызу;

накіроўваць дзяржаўным і іншым органам, а таксама прадпрыемствам і арганізацыям паведамленні аб парушэннях заканадаўства, выяўленых пры вырашэнні гаспадарчых спрэчак, з рэкамендацыямі аб іх устараненні;

запытваць інфармацыю ад дзяржаўных і іншых органаў, навуковых устаноў і інфармацыйных цэнтраў.

Патрабаванні суддзі, што прад'яўляюцца ў межах паўнамоцтваў гаспадарчага суда, абавязковыя для дзяржаўных і іншых органаў, прадпрыемстваў і арганізацый, а таксама службовых асоб, да якіх гэтыя патрабаванні звернуты.

Службовыя асобы, якія не выканалі законныя патрабаванні суддзі, нясуць прадугледжаную заканадаўствам адказнасць.

Артыкул 17. Абавязкі суддзі гаспадарчага суда

Суддзя пры вырашэнні гаспадарчых спрэчак і ажыццяўленні папераджальнай дзейнасці абавязан дакладна выконваць патрабаванні заканадаўства, забяспечваць культуру і выхаваўчае ўздзеянне судовага працэсу. Суддзя гаспадарчага суда абавязаны павышаць узровень прафесіянальных ведаў.

